У параўнанні з мінулым годам колькасць кароў у прыватным сектары Маладзечанскага раёна зменшылася на 126 галоў. Ці значыць гэта, што карова на падворку не патрэбна?

МС

У свеце больш за 6800 моў і дыялектаў. Згодна з прагнозамі вучоных, цягам бліжэйшых ста гадоў 80-90 працэнтаў іх знікнуць. Мы сваю яшчэ можам абараніць...

СТАР 6

Грудное кармленне зніжае рызыку раку, у тым ліку анкалагічных захворванняў рэпрадуктыўнай сістэмы. Вучоныя сцвярджаюць, што рызыка ўзнікнення раку грудзей зніжаецца ў кормячых маці на 25 працэнтаў.

СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЖНІЎНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 141 (27506) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

НАВЕСЦІ ПАРАДАК З ЦЭНАЎТВАРЭННЕМ У БУДАЎНІЧАЙ ГАЛІНЕ

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч патрабуе ад дзяржаўных органаў выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы аб навядзенні парадку з цэнаўтварэннем у будаўнічай галіне. Аб гэтым кіраўнік урада заявіў на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, дзе разглядаўся праект канцэпцыі новай будаўнічай палітыкі Беларусі, перадае БелТА.

«Трэба заканчваць вольніцу (*у цэнаўтварэнні*. — **Заўвага БелТА**), якая сёння ёсць, — запатрабаваў Міхаіл Мясніковіч. — Прыняты ўказ, у адпаведнасці з якім мы павінны працаваць у фактычных цэнах, цэнах сённяшняга дня, а не прымяняць нейкія каэфіцыенты пераліку, даліку». Паводле слоў прэм'ер-міністра, будаўнікі «сфарміравалі нейкі свой абмежаваны свет, свае індэксы, што, безумоўна, выклікае вельмі сур'ёзнае нездавальненне як у юрыдычных, так і ў фізічных асоб, якія звяртаюцца да паслуг будаўнічага комплексу».

Асаблівую ўвагу Міхаіл Мясніковіч звярнуў на пытанні ўзмацнення адказнасці ў будаўнічай сферы. «Сёння вялікая частка праблем будаўнічага комплексу звязана з нездавальняючай работай заказчыка. У план падрадных работ уключаюцца аб'екты зусім не гатовыя, без праектна-каштарыснай дакументацыі, з недастатковым або частковым фінансаваннем, — канстатаваў прэм'ер-міністр. — У выніку мы маем незадавальненне заказчыкам і прэтэнзіі з боку насельніцтва». На думку прэм'ер-міністра, Мінбудархітэктуры пусціла гэта пытанне на самацёк. У выніку праграмы фарміруюць або трэсты, самастойна, у пошуках больш выгаднага заказу, або выканкамы. «Гаррайвыканкамы фарміруюць праграмы і пасля адыходзяць ад адказнасці, якая ўскладаецца выключна на будаўнікоў», — сказаў ён.

«Я зусім не спрабую апраўдаць нізкую якасць работ будаўнікоў, невыкананне тэрмінаў, але ўсё гэта пачынаецца з таго, наколькі аб'ект гатовы да правядзення будаўніча-мантажных работ, — дадаў прэм'ер-міністр. — Часам атрымліваецца так, што акт дзяржаўнай камісіі аб прыёмцы аб'екта ў эксплуатацыю па часе супадае з дакументам аб зацвярджэнні праектна-каштарыснай дакументацыі на гэту будоўлю».

Асобна Міхаіл Мясніковіч спыніўся на пытаннях будаўнічага кантролю і нагляду. «У нас у краіне функцыі падрадчай дзейнасці аддзелены ад пытанняў будаўнічага кантролю і нагляду. Але наколькі аб'ектыўныя гэтыя дзве структуры, якія ажыццяўляюць названыя функцыі? — паставіў пытанне кіраўнік урада. — Напрошваецца прыклад нейкага савецкага ўзору дзяржбуду, дзе былі цэны, каштарысы, будаўнічы кантроль і будаўнічы нагляд. У выніку ўсё гэта размыта, раздзелена, і, урэшце, мы цэлымі камісіямі шукаем там вінаватых».

АБУЦЬ У ЛАПЦІ? ЛЁГКА!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У бліжэйшую суботу ў Дрыбіне пройдзе чарговы фестываль народнай творчасці «Дрыбінскія таржкі» — ужо трэці па ліку. Галоўнай «разынкай» святочнага фэсту-кірмашу стане дэманстрацыя менавіта мясцовых вырабаў — валёнак і лапцяў. Дзякуючы майстрам Дрыбіншчыны, тэхналогія вырабу гэтых экалагічных відаў «народнага» абутку не толькі добра захавалася, але і ўзята пад ахову дзяржавы, як гісторыка-культурная каштоўнасць. Вялікую калекцыю лыкавых пляцёнак рыхтуюць да таржкоў майстры Дома рамёстваў вёскі Кароўчына, будуць там і вырабы народнага майстра, члена Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Ларысы Залікоўскай *(на фотаздымку)*.

ЛІЧБА ДНЯ

1,7 млн

жыхароў краіны стаяць на ўліку ў тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН), паведамляе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Сацыяльныя паслугі грамадзянам і сем'ям, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, у рэспубліцы сёння прадастаўляюць 149 цэнтраў. Сярод тых, хто стаіць на ўліку ў гэтых цэнтрах, — 125 800 адзіноких і 556 700 пажылых людзей, якія пражываюць адзінока. У студзені— чэрвені аддзяленні сацыяльнай дапамогі на даму аказвалі паслугі 89,4 тыс. непрацаздольным грамадзянам (гэта пажылыя людзі, інваліды I і II груп).

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.08.2013 г.

Долар ЗША	8880,00	■
Еўра	11780,00	■
Рас. руб.	269,00	▼
Укр. грыўня	1094,00	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 25°
Віцебск	+ 22°
Гомель	+ 25°
Гродна	+ 23°
Магілёў	+ 23°
Мінск	+ 23°

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА:

«Палата прадстаўнікоў сканцэнтравана на заканадаўчым вырашэнні канкрэтных, запатрабаваных жыццём задач»

— Уладзімір Паўлавіч, у любой справе асабліва важны пачатак і перш за ўсё — псіхалагічна, каб умацоўвалася ўпэўненасць у сваіх сілах і не згасала жаданне смела імкнуцца, дамагацца большага. На ваш погляд, ці сталі такім натхняльным пачаткам для Палаты прадстаўнікоў цяперашняга склікання дзве мінулыя сесіі?

— Натхняльным? Несумненна, інакш бы вынікі нашай работы былі б іншымі. І не толькі статыстычна — прыняты 64 законапраекты ў другім чытанні, у тым ліку 29 аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў і пагадненняў, і 51 — у першым, але і па змястоўнай значнасці сфарміраванай заканадаўчай базы.

— У чым гэтая значнасць праяўляецца?

— Яна праяўляецца ў тэматычным дыяпазоне нарматыўна-прававых актаў, іх актуальнасці, адпаведнасці прыярытэтам развіцця краіны і задачам, вызначаным кіраўніком дзяржавы ў штогадовых пасланнях беларускаму народу і парламенту. Заканадаўства абнаўляецца ў цеснай увязцы з работай, якая праводзіцца ў краіне па мадэрнізацыі эканомікі, умацаванні нацыянальнай бяспекі, развіцці сацыяльнай сферы, міжнароднага супрацоўніцтва, прыняцці дзяржавай дадатковых гарантый сацыяльнай абароны тых катэгорый грамадзян, якія маюць у ёй асаблівую патрэбу. Гэтыя пытанні праходзяць скразной лініяй праз усё рэгуляторнае поле, створанае намі на дзвюх сесіях.

— Якія заканадаўчыя рашэнні прынцыпова важныя, ключавыя?

— Такія рашэнні ёсць у кожным тэматычным блоку, самы буйны з якіх — па пытаннях эканомікі. Я выдзеліў бы тут найперш стымуляванне дзелавой актыўнасці, прытоку інвестыцый, далейшае паляпшэнне ўмоў для гаспадарчай дзейнасці, у тым ліку ў аграпрамысловым комплексе. Прадметна і мэтанакіравана мы займаемся таксама развіццём сацыяльнага заканадаўства. У цэнтры ўвагі дэпутатаў знаходзяцца пытанні дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, працоўных і жыллёвых адносін, аховы працы, адукацыі, аховы здароўя, культуры, фізічнай культуры і спорту. Як вядома, дзяржавай значна павялічаны памеры дапамогі па цяжарнасці, родах і доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Гэта пазітыўна ўплывае на паляпшэнне ў нашай краіне дэмаграфічнай сітуацыі.

СТАР 2

РАБОЧАЯ ПРАФЕСІЯ ГАРАНТУЕ САМАСТОЙНАСЦЬ І ВЫСОКІ ЗАРОБАК

...у гэтым упэўнена большасць навучэнцаў прафтэхустаноў

З кожным годам пытанне, дзе ўзяць рабочыя рукі, становіцца ўсё больш актуальным для беларускай эканомікі. Ні для каго не сакрэт, што ў рэйтынгу прафесій, якім аддае перавагу сучасная моладзь, рабочыя прафесіі або ўвогуле не фігуруюць, або займаюць там далёка не першыя пазіцыі. Прыёмная кампанія ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах распачалася яшчэ 15 чэрвеня. І першы месяц паказаў, што прывабіць навучэнцаў установам прафтэхадукацыі будзе не так і проста. Магчыма, пасля завяршэння прыёмнай кампаніі ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах сітуацыя і зменіцца ў лепшы бок, бо многія маладыя людзі разглядаюць навучанне ў прафтэхустановах як «запасны аэрадром». Аднак наўрад ці іх выбар і навучальнай установы, і прафесіі будзе свядомым.

СТАР 2

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

УСТАНОЎЛЕНЫ ТАРЫФЫ НА ПРАЕЗД ПА ПЛАТНЫХ АЎТАДАРОГАХ КРАІНЫ

З сённяшняга дня ў краіне афіцыйна ўводзіцца новая электронная сістэма збору аплаты за праезд. BelToll выкарыстоўвалася ў тэставым рэжыме 2 летнія месяцы і даказала сваю эфектыўнасць. Платнымі пакуль стануць 815 км беларускіх дарог. Тарыфы вызначаны ў пастанове Міністэрства транспарту і камунікацый № 21 «Аб некаторых пытаннях спагнання платы за праезд транспартных сродкаў па платных аўтамабільных дарогах Рэспублікі Беларусь» ад 17 чэрвеня 2013 года, якая была апублікавана ў ўчора на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Тарыф для разліку памеру платы за праезд легкавых аўтамабіляў устаноўлены ў памеры 0,04 еўра/км, аўтатранспарту з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 т з дзвюма восямі — 0,08 еўра/км, з трыма восямі — 0,10 еўра/км, чатырма і больш восямі — 0,12 еўра/км.

У пастанове паведамляецца, што памер платы за праезд транспартных сродкаў па платных аўтамабільных дарогах у павялічаным памеры складзе 50 еўра ў выпадку няпоўнай аплаты і 100 еўра ў выпадку неаплаты для кіроўцаў легкавых аўтамабіляў, 130 еўра ў выпадку няпоўнай аплаты і 260 еўра ў выпадку неаплаты для кіроўцаў транспартных сродкаў з дапушчальнай агульнай масай больш за 3,5 т.

Сума платы за праезд транспартных сродкаў па платных аўтамабільных дарогах нашай краіны, у тым ліку платы за праезд транспартных сродкаў у павялічаным памеры і закладнога кошту прылады электроннай аплаты, што бяруцца ў беларускіх рублях, да 25 рублёў будзе акругляцца да 0, ад 25 рублёў уключна да 75 — да 50 рублёў, звыш 75 уключна — да 100 рублёў.

Тэрмін залічэння грашовых сродкаў эмітэнтам паліўнай карты на рахункі дзяржаўнай установы «Белаўтастрада» ад платы за праезд транспартных сродкаў па платных аўтамабільных дарогах у рэжыме аплаты па факце, перадаплаты, закладнога кошту прылад электроннай аплаты, выплачаных пры дапамозе паліўных карт, не павінен перавышаць 45 каляндарных дзён. Пры гэтым тэрмін напрамку рахункаў дзяржустановай «Белаўтастрада» эмітэнту паліўнай карты не павінен перавышаць адзін каляндарны месяц і быць менш за тры працоўныя дні.

Акрамя таго, пастановай Міністэрства транспарту і камунікацый № 22 «Аб устанаўленні мінімальнага памеру перадаплаты і максімальнага памеру астатку сродкаў перадаплаты для дагавораў карыстання платнымі аўтамабільнымі дарогамі Беларусі ў рэжыме перадаплаты» ад 17 чэрвеня 2013 г. устаноўлены мінімальны памер перадаплаты ў суме 25 еўра і максімальны памер астатку сродкаў перадаплаты ў суме 350 еўра, якія дзейнічаюць для ўсіх дагавораў карыстання платнымі аўтамабільнымі дарогамі Рэспублікі Беларусь у рэжыме перадаплаты.

Пастановы Мінтранса № 21 і № 22 уступаюць у сілу з 1 жніўня 2013 года, калі ў Беларусі пачнецца камерцыйная эксплуатацыя сістэмы BelToll і спагнанне платы за праезд.

Як паведамлялася раней, BelToll з'яўляецца электроннай сістэмай збору платы за праезд, якая дзейнічае ў Беларусі з 1 ліпеня 2013 года ў рэжыме тэхнічнай эксплуатацыі. Яна заснавана на выкарыстанні тэхналогіі спецыялізаванай радыёсувязі на кароткіх адлегласцях, якая дазваляе выконваць разлік без неабходнасці прыпынку транспартных сродкаў.

Падлічана, што платнымі стануць 815 км дарог краіны. Гэта на першым этапе датычыцца ўсяго працягу аўтамагістралі М-1/Е30 Брэст (Казловічы) — Мінск — мяжа Расіі (Рэдзькі), а таксама асобных участкаў аўтамабільных трас М-2 Мінск — Нацыянальны аэрапорт Мінск, М-3 Мінск — Віцебск, М-4 Мінск — Магілёў, М-5 / Е 271 Мінск — Гомель і М-6 / Е 28 Мінск — Гродна — мяжа Польшчы (Брузгі).

У адпаведнасці з указам № 426 ад 27 верасня 2012 года, ад дарожных зборaў вызваляюцца транспартныя сродкі, зарэгістраваныя на тэрыторыі краін Мытнага саюза, з тэхнічна дапушчальнай агульнай масай не больш за 3,5 т. Бясплатна змогуць праехаць мапеды і матацыклы, зарэгістраваныя ў Беларусі, колавыя трактары і самаходныя машыны, транспартныя сродкі аператыўнага прызначэння, а таксама аўтатранспарт, які выкарыстоўваецца ў мэтах забеспячэння абараназдольнасці і правапарадку. Не трэба будзе плаціць кіроўцам маршрутак для гарадскіх перавозак пасажыраў, транспарту па лініі аказання меддапамогі, ліквідацыі надзвычайных сітуацый або перавозак грузаў гуманітарнай дапамогі насельніцтву Беларусі і іншых краін.

Сяргей КУРКАЧ.

Урад Беларусі вызначыў пералік аўтадарог, на якіх з 1 жніўня будуць спаганяць плату за праезд транспартных сродкаў.

Платнымі стануць 815 км дарог краіны:

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БОЛЬШ ЗА 22 ТЫС. ЯПОНЦАЎ ПАЦЯРПЕЛІ АД СПЯКОТЫ

Больш за 22 тыс. японцаў былі дастаўлены ў бальніцы з цеплавымі ўдарамі ў ліпені. Гэта рэкордны паказчык за перыяд з 2008 года, паведаміла пажарнае ўпраўленне краіны, якое таксама выконвае функцыі «хуткай дапамогі». Усяго з 1 па 28 ліпеня ў бальніцы былі дастаўлены з перагрэвам 22363 чалавекі. З іх амаль 48% — людзі, старэйшыя за 65 гадоў, 13,4% — дзеці ад 7 да 17 гадоў. Многія з іх атрымалі цеплавыя ўдары ў душных памяшканнях, часцей за ўсё — у сябе дома. На думку ўлад, некаторыя з загінулых прынцыпова не ўключалі кандыцыянеры з эканоміі. Усяго за першыя два тыдні месяца па ўсёй краіне загінулі 44 чалавекі.

ІРАН АДГУКНУЎСЯ НА ПАВЕДАМЛЕННІ АБ НОВЫХ ЗРК

«Што тычыцца комплексаў «Антэй-2500», то пакуль гэта толькі словы. Ніякіх дамоўленасцяў не дасягнута і ніякіх перамоў не вядзецца», — заявіў пасол Ірана ў Маскве Махмуд Рэза Саджадзі. Раней паведамлялася, што Масква, каб урэгуляваць зрыў здзелкі па С-300, прапанавала Тэгерану ЗРК «Антэй».

ЯКІЯ ЖАНЧЫНЫ ЧАСЦЕЙ ХВАРЭЮЦЬ НА РАК?

Рост чалавека звязаны з шэрагам фактараў, якія вызначаюць рызыку раку. Сюды ўваходзяць гены, харчаванне, уплыў навакольнага асяроддзя. Усё гэта ўздзейнічае ў дзяцінстве, калі закладваюцца тэмпы росту, піша USA Today. У апошнім даследаванні росту аналізаваліся даныя 21 тыс. жанчын 50-79 гадоў з адным і больш інвазіўным ракам. Асноўная ідэя ў тым, што некаторыя генетычныя асаблівасці, якія даюць вялікі рост, таксама могуць садзейнічаць узнікненню гэтага захворвання. У высокіх людзей шмат клетак у целе, органы буйней, што павялічвае рызыку мутацый. Так, рызыка расце з кожнымі дадатковымі 10 сантыметрамі, гаворыцца ў справаздачы Універсітэта Ешыва. У прыватнасці, рызыка меланомы, раку грудзей, яечнікаў, тоўстай кішкі і эндаметрыя падскоквае на 13-17%, а нырак, шчытападобнай залозы, крыві і прамой кішкі — на 23-29%. Гэтая сувязь актуальная для жанчын, якія перажылі менапаўзу, і для мужчын. Затое, паводле незалежных даследаванняў, вялікі рост абараняе ад інсультаў і хвароб сэрца.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КРАІНЫ БАЛТЫІ І ПОЛЬШЧА ДАМОВІЛІСЯ АБ СТВАРЭННІ МІЖНАРОДНАЙ ЧЫГУНКІ

Падрыхтоўка да рэалізацыі праекта міжнароднай чыгуначнай магістралі «Рэйл Балтыка» выйшла на фінішную прамую — краіны Балтыі і Польшча дамовіліся аб стварэнні прадпрыемства, якому трэба будзе каардынаваць работы па прасоўванні праекта.

Сумеснае прадпрыемства спачатку будзе належаць тром краінам Балтыі, аднак дэкларацыя пакіне для Польшчы і Фінляндыі магчымасць далучыцца да ўдзелу ў ім. Чыгункі краін Балтыі з-за адсутнасці вузкай каляіны пакуль інтэграваныя толькі на ўсход. Паводле задумы, міжнародны праект «Рэйл Балтыка» забяспечыць хуткасныя (да 240 км/г) чыгуначныя зносіны ад Хельсінкі да Варшавы і далей да Берліна на захадзе, у перспектыве да Адрыятыкі на поўдні. Чакаецца, што праект вузкай каляіны да Варшавы будзе рэалізаваны да 2023 г.

КАРАТКА

Ільняныя заводы Беларусі будуць аб'яднаны ў рэгіянальныя холдынгі.

Рэспубліканскі бюджэт Беларусі ў першым паўгоддзі 2013 года выкананы з прафіцытам Br0,8 трлн, або 0,3 працэнта ВУП.

У Мінску з 22.00 2 жніўня да 5.00 5 жніўня ў сувязі з капітальным рамонтам праспекта Незалежнасці цалкам закрываецца рух на ўчастку праспекта ад вуліцы Янкі Купалы да вуліцы Казлова.

Скутарысты правядуць 2 жніўня ў Мінску Fashion Scooter Fest. Калона з хлопцаў у касцюмах і дзяўчат у вячэрніх сукенках і на абцасах праедзе па горадзе ад Партызанскага праспекта па вуліцах Кастрычніцкай, Першамайскай, Фрунзэ да парку імя Горкага, дзе ўсіх удзельнікаў і гасцей мерапрыемства чакае забаўляльная праграма.

Навукоўцы вызначылі, што людзі найбольш шчаслівыя ва ўзросце 23-х і 69 гадоў. Ва ўзросце крыху за 20 маладыя людзі яшчэ не маюць багажу адмоўнага вопыту, які зніжае ўзровень чаканняў. Людзі ва ўзросце пад 70 адчуваюць задавальненне ад таго, што ўжо навучыліся не шкадаваць аб мінулым.

ISSN 1990 - 763X

ПАЧАЛАСЯ РАСПРАЦОЎКА ПРАЕКТА ЎКАЗА АБ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОЗЕ ВЕТЭРАНАМ ВАЙНЫ

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны прыступілі да падрыхтоўкі праекта ўказа аб аказанні матэрыяльнай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і людзям, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, да 70-годдзя вызвалення Беларусі.

Такіх людзей з кожным годам, на жаль, становіцца ўсё менш і менш. Так, сёння ў Беларусі пражываюць 24 тыс. ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, з іх 16,7 тыс. інвалідаў і ўдзельнікаў вайны. А таксама 33,1 тыс. грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, у тым ліку 1,6 тыс. членаў сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі ў гады вайны, 30,6 тыс. былых вязняў фашызму, 937 інвалідаў з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтва.

Увага гэтым людзям аказваецца не толькі напярэдадні свят. Так, у межах падпраграмы «Сацыяльная падтрымка ветэранаў, асоб, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў, пажылых людзей і інвалідаў» Комплекснай праграмы развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011-2015 гады абследуюцца ўмовы іх жыцця. Прычым абследаванні праводзяцца ва ўсіх населеных пунктах без выключэння. Толькі сёлета за паўгода больш за 5,9 тыс. прадстаўнікоў гэтай катэгорыі была аказана дапамога ў рамонце кватэр, дамоў, надворных пабудоў, печаў, электраправодак, сантэхнічнага, газавага, электратэхнічнага абсталявання, устаноўцы пажарных апавяшчальнікаў на суму Br4,1 млрд. Са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва матэрыяльную дапамогу ў студзені—чэрвені гэтага года атрымалі 38,9 тыс. чалавек на суму Br13,4 млрд, са сродкаў мясцовых бюджэтаў — 14,9 тыс. чалавек на суму Br19,1 млрд.

Надзея ДРЫЛА.

Кошт участкаў на аўкцыёнах у Мінску ў прыватную ўласнасць дасягае Br860 млн

Стартавы кошт зямельных участкаў на аўкцыёнах у Мінску для прадастаўлення ў прыватную ўласнасць дасягае Br860 млн. Пра гэта паведаміў на аператыўнай нарадзе ў мэрыі дырэктар Мінскага гарадскога цэнтра нерухомай маёмасці Станіслаў Коцікаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У 2012 годзе ў сталіцы праведзена 22 аўкцыёны і рэалізавана 24 участкі, у 2013 годзе — 15 аўкцыёнаў, прададзена 20 участкаў на суму больш як Br19 млрд. Усяго пакупнікам прапануецца 102 участкі (на права арэнды, праектавання і будаўніцтва, у прыватную ўласнасць).

«Калі па пляцоўках, прапанаваных у арэнду, попыт ёсць, яны прывабныя для размяшчэння аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання, аказання паслуг насельніцтву, то 22 участкі для прадастаўлення ў прыватную ўласнасць для будаўніцтва і абслугоўвання аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, на жаль, у гэтым годзе не знайшлі пакупнікоў. Яны выстаўляліся неаднаразова, некаторыя па 7-9 разоў, але з-за высокага кошту не былі запатрабаваны», — адзначыў Станіслаў Коцікаў.

Паводле яго слоў, павелічэнне кадастравай вартасці зямлі ў гэтым годзе паўплывала на канчатковы кошт. Так, калі раней некаторыя ўчасткі ў раёне вул. Папярнянскай каштавалі каля Br450 млн, то цяпер — Br860 млн. «Іх не бралі і па папярэдняй цане, не гаворачы ўжо пра лічбу ў амаль Br1 млрд. Трэба шукаць іншыя падыходы да іх рэалізацыі, можа, прапанаваць у арэнду на 99 гадоў», — адзначыў Станіслаў Коцікаў.

«Палата прадстаўнікоў сканцэнтравана на заканадаўчым вырашэнні канкрэтных, запатрабаваных жыццём задач»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прынясуць грамадству карысць і прынятыя парламентам рашэнні па ўмацаванні нацыянальнай бяспекі, удасканаленні судавытворчасці, ад чаго залежыць упэўненасць людзей у абароненасці сваіх правоў і ўвогуле стан правапарадку. Запатрабаваныя жыццём змяненні ўнесены ў нарматыўна-прававую базу экалогіі і прыродакарыстання. Пашырылася заканадаўства міжнароднага супрацоўніцтва нашай краіны. Адзначу ратыфікацыю шэрагу новых інтэграцыйных пагадненняў у рамках Еўразійскай эканамічнай супольнасці і СНД.

— Са сказанага вамі вынікае, што дэпутаты сур'ёзна заглыбіліся ў заканатворчую работу.

— Да любой работы, якой займаешся, трэба ставіцца сур'ёзна, з усёй адказнасцю. А ў заканатворчасці гэта, я сказаў бы, умова з умоў.

— Умова чаго?

— Высокай якасці законаў, іх адэкватнасці патрабаванням часу.

— Але ж час даволі імклівы, а ў перыяд глабальных эканамічных трансфармацый — асабліва. Ці лёгка трымаць руку «на пульсе»?

— Ва ўсякім разе гэта не ў цяжар, калі ёсць прафесіяналізм, разуменне задач краіны і чуйнасць да сусветных тэндэнцый. Плюс абавязковае ўзаемаразуменне па прынцыпова важных пытаннях з партнёрамі па заканатворчым працэсе. Законы ж ствараюцца калектыўна.

— І, заўважу, нярэдка даволі працягла, як тыя ж, напрыклад, знакавыя для другой парламенцкай сесіі законы аб інвестыцыях, канцэсіях, бухгалтарскім уліку і справаздачнасці і іншыя, пра змест якіх ужо расказвалася ў друку, у тым ліку і на старонках «Звязды». Як вы лічыце, яны адпавядаюць брэнду законаў новага пакалення?

— У адваротным выпадку яны не былі б прыняты. За ўсімі законамі, асабліва базавымі, сістэмнымі, — стратэгічныя мэты дзяржавы: павышэнне якасці жыцця, дабрабыту людзей на аснове ўстойлівага эканамічнага росту. Удасканальваючы прававы механізм, мы ўлічваем і ацэньваем комплекс розных фактараў, у тым ліку абгрунтаванасць новаўвядзенняў і перспектывы прававырымяняльнай практыкі. Хаця дапрацоўка праектаў названых і некаторых іншых законаў ішла няпроста, іх прыняцце ў выніку вялікай работы, праведзенай дэпутатамі і экспертамі, стала ўзважаным і запатрабаваным крокам па шляху абнаўлення заканадаўства. Несумненна, прававыя навацыі адэкватныя задачам новага этапу развіцця краіны.

— Аднак жа трэнд дынамікі эканамічнага росту не настолькі станоўчы, як бы хацелася.

— Пакуль што так, але не адна Беларусь сутыкнулася з эканамічнымі цяжкасцямі. Гэта дыктуецца як СНД, так і большасці краін Еўрасаюза і свету. Ды і ў вядучых эканоміках праблем хапае. Наш урад, як вядома, прадпрымае меры па паскарэнні эканамічнага росту, сярод якіх і ўдасканаленне прававой базы. Новыя заканадаўчыя рашэнні эканамічнага блока, у тым ліку стымулюючае прыцягненне інвестыцый, мы разглядаем як паслядоўныя, сістэмныя дзеянні па павышэнні эфектыўнасці рэальнага сектара эканомікі. Менавіта ў гэтым каштоўнасць новых законаў. Хачу падкрэсліць: тое, што падчас разгару сусветнага эканамічнага крызісу нашай эканомікай прадэманстравана ўстойлівасць да сур'ёзных выпрабаванняў, пацвярджае трываласць закладзенага ў мінулыя гады нарматыўна-прававога падмурка. Цяпер мы ўмацоўваем заканадаўчую базу з улікам правапрымяняльнай практыкі і надзённых задач.

— Уладзімір Паўлавіч, як вы ацэньваеце палітычны рэсурс цяперашняга дэпутацкага складу Палаты прадстаўнікоў?

— Ён залежыць у першую чаргу ад прадуктыўнасці заканадаўчай работы, таму яе інструментарый завостраны на дасягненне канкрэтных якасных вынікаў. Маю на ўвазе прадметны падыход да максімальна магчымай канкрэтызацыі законапраектаў, скарачэння нормаў непрамога дзеяння, пашырэнне «нулявога чытання» і грамадскага абмеркавання паступіўшых у Палату прадстаўнікоў нарматыўна-прававых актаў, маніторынг заканадаўства, радыётрансляцыі з сумесных пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, на якіх члены ўрада адказваюць на пытанні парламентарыяў. На такіх пасяджэннях заслухоўваюцца даклады намеснікаў прэм'ер-міністра, абмяркоўваюцца самыя важныя праблемы эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны і шляхі іх вырашэння. Варта сказаць і пра рэгулярнае правядзенне выязных пасяджэнняў пастаянных камісій, што дапамагае акцэнтаваць наспелыя пытанні і выпрацоўваць агульную пазіцыю па карэкціроўцы нарматыўна-прававой базы.

— Заканатворчы рух ідзе па розных лініях?

— Па розных, але ў адным рэчышчы. І прыносіць плён.

— Час летніх адпачынкаў для гэтай работы, напэўна, не вельмі спрыяльны?

— Ён не з'яўляецца перашкодай, калі ёсць жаданне і ўменне прафесіянальна і творча працаваць над законамі. Пасля завяршэння вясновай сесіі Палаты прадстаўнікоў заканатворчая работа не спынілася. Яе эпіцэнтр перамясціўся з Авальнай залы ў пастаянныя камісіі і рабочыя групы па падрыхтоўцы законапраектаў. На так званых «летніх канікулах» толькі адпускнікі. Ідзе звычайны нарматворчы працэс. Рыхтуюцца законапраекты да трэцяй сесіі, а іх у камісіях дапрацоўваецца ўжо больш за пяцьдзясят. Акрамя гэтага, праводзяцца міжнародныя сустрэчы. Дэпутаты ўдзельнічаюць і ў міжпарламенцкіх мерапрыемствах. Мы па-ранейшаму выязджаем у свае выбарчыя акругі, праводзім прыёмы выбаршчыкаў, наведваем прамысловыя і аграрныя прадпрыемствы, палеткі, гутарым з камбайнерамі і механізатарамі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі, цікавімся ходам палявых работ. Працуем у звычайным рытме.

— Што вы адзначыце сярод законапраектаў, якія стануць ядром праграмы асенняй сесіі?

— Цэнтральным сесійным пытаннем будзе праект закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2014 год. Дэпутатам таксама прадстаіць завяршыць работу над буйным пакетам законапраектаў другога чытання, сярод якіх такія тэмы, як развіццё канкурэнцыі, энергазберажэнне, працоўныя адносіны, паштовая сувязь, гандаль і грамадскае харчаванне, прафілактыка правапарушэнняў, мытнае рэгуляванне. Шэраг нарматыўна-прававых дакументаў мы абмяркуем у першым чытанні. Яны рэгламентуюць пытанні эканамічнай неплацежаздольнасці, цэнаўтварэння, аховы здароўя, шлюбу і сям'і і іншыя. Новыя законапраекты працягваюць паступаць, так што парадак дня сесіі сфарміруецца насычаны.

— Бюджэтныя параметры, як вядома, пакуль яшчэ распрацоўваюцца і ўзгадняюцца ва ўрадзе. Якім у цэлым чакаецца рэспубліканскі бюджэт?

— Нармальная жыццядзейнасць краіны ў 2014 годзе будзе забяспечана. Гэта — галоўнае.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

■ Падрабязнасці

МІМА БЮДЖЭТУ

За два гады службовымі асобамі пагранічных пунктаў па каранціне раслін «Каменны Лог», «Беняконі-1», «Катлоўка», «Прывалкі», «Бераставіца» і «Брузгі» прычынена шкода рэспубліканскаму бюджэту на суму больш за 5,2 мільярда рублёў, паведамляе Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.

Гэта выявілася падчас праверкі Гродзенскай абласной дзяржаўнай інспекцыі па насенняводстве, каранціне і ахове раслін па пытаннях фітасанітарнага кантролю (нагляду) і адпаведнага афармлення падкаранцінай прадукцыі, якая транзітам перамяшчаецца праз тэрыторыю Беларусі.

Спачатку, як паведамляла «Звязда», злоўжыванні з аплатай паслуг гэтай інспекцыі і плацяжамі ў бюджэт былі ўстаноўлены ў пункце пропуску «Каменны Лог». Толькі за лістапад 2011-га і красавік мінулага года за афармленне 1190 і 1295 транспартных сродкаў бюджэт не атрымаў даход, які перавышае адпаведна 371 мільён рублёў і 436 мільёнаў рублёў. Па матэрыялах праверкі ў дачыненні да службовых асоб інспекцыі было заведзена 8 крымінальных спраў. З'явіліся падставы праверыць у пазапланавым парадку і іншыя пагранічныя пункты па каранціне раслін.

Увогуле сумесна з супрацоўнікамі УУС Гродзенскага аблвыканкама пры садзейнічанні работнікаў мытных органаў было прааналізавана больш за 50 тысяч таварна-транспартных і іншых суправаджальных дакументаў. У пагранічных пунктах па каранціне раслін выяўлены шматлікія парушэнні заканадаўства пры афармленні транзітнай прадукцыі, якая падлягала фітасанітарнаму кантролю (нагляду). Службовыя асобы аглядалі і афармлялі адпаведныя транспартныя сродкі і ў той жа час частка грашовых сродкаў за аказаную паслугу на рахунак інспекцыі не паступала, а імі прысвойвалася. У выніку такога разумення гэтымі спецыялістамі сваіх абавязкаў за перыяд з 1 студзеня 2011-га па 31 снежня 2012 года ў пагранічных пунктах па каранціне раслін «Каменны Лог», «Катлоўка», «Беняконі-1», «Брузгі», «Прывалкі» і «Бераставіца» прычынена шкода рэспубліканскаму бюджэту на суму больш за 5,2 мільярда рублёў.

Па выніках праверкі кіраўнік Гродзенскай абласной інспекцыі па насенняводстве, каранціне і ахове раслін і яго намеснік вызвалены ад займаемых пасад. Камітэт дзяржаўнага кантролю накіраваў матэрыялы праверкі ва УУС Гродзенскага аблвыканкама для дачы ацэнкі дзеянням (ці бяздзеянню) службовых асоб. Прымаюцца меры па кампенсацыі прычыненых дзяржаве страт.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

РАБОЧАЯ ПРАФЕСІЯ ГАРАНТУЕ САМАСТОЙНАСЦЬ І ВЫСОКІ ЗАРОБАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спецыялісты «невыпадковага профілю»

— На працягу апошняга навучальнага года (з кастрычніка па май) аналітычны цэнтр EcooM праводзіў сацыялагічнае даследаванне, якім былі ахоплены больш як 2 тысячы навучэнцаў 107 устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі нашай краіны, — расказаў журналісту «Звязды» **кіраўнік цэнтра Сяргей МУСІЕНКА**. — Мы задалі рэспандэнтам каля 35 пытанняў, якія тычыліся іх прафесійнага самавызначэння, ацэнкі жыццёвых перспектыў, умоў навучання і стэрэатыпаў вакол прафесійна-тэхнічнай адукацыі, распаўсюджаных у нашым грамадстве. Напрыклад, цікавіліся ў маладых людзей матывамі выбару ўстановы адукацыі. Больш як 51% адказалі, што ім падабаецца абраная прафесія. 17,5% паведамілі, што для іх мела значэнне рэальная магчымасць працаўладкавання. Уплыў сям'і адзначылі 15 працэнтаў удзельнікаў. Прыкладна столькі ж рэспандэнтаў выбрала адказы «Тут прасцей навучацца», «Тут вучыцца бліжэй да дома» і «Трэба было дзесьці вучыцца». 12 працэнтаў рэспандэнтаў пайшлі навучацца ў прафэхустанову таму, што не паступілі ў ВНУ і ССНУ. І амаль столькі ж канстатавала выпадковасць свайго выбару. А вось прэстыжнай сваю ўстанову адукацыі лічаць толькі 11 працэнтаў з агульнай колькасці рэспандэнтаў.

Навучэнцаў папрасілі назваць крыніцы, з якіх яны даведаліся пра сваю спецыяльнасць. «Ад сяброў і знаёмых» — так адказалі 48,5% рэспандэнтаў. «У сям'і» — 31%. «У школе» — 30%.

30% маладых людзей прыбеглі да дапамогі інтэрнэту. Згадваліся таксама дні адкрытых дзвярэй ва ўстановах адукацыі, сродкі масавай інфармацыі, дапамога цэнтраў прафарыентацыі і заняткі ў гуртках.

«12 працэнтаў рэспандэнтаў пайшлі навучацца ў прафэхустанову таму, што не паступілі ў ВНУ і ССНУ. І амаль столькі ж канстатавалі выпадковасць свайго выбару»

Галоўныя арыенціры

На пытанне «Якія магчымасці можа даць ваша прафесія?» большая частка навучэнцаў (57%) назвала высокі заробак. Каля 42% навучэнцаў выказала ўпэўненасць у тым, што авалоданне прафесіяй дазволіць ім стаць самастойнымі, 31,6% упэўнены, што змогуць зрабіць кар'еру. У тым, што будучая прафесія дазволіць адчуваць сябе прафесіяналам, упэўнены 28,5% рэспандэнтаў. І 25,5% лічаць, што ў іх будуць добрыя ўмовы работы. А вось пра тое, што будучая прафесія дапаможа ім заваяваць павагу людзей, паведамілі толькі 14% навучэнцаў прафэхустаноў.

На пытанне «Што для вас найбольш важна ў будучай рабоце?» больш як 66% навучэнцаў на першае месца паставіла адказ «Зарабляць шмат грошай». У пяцёрку самых распаўсюджаных адказаў увайшлі таксама наступныя: «Працаваць у добрым калектыве» (57%), «Мець добрыя ўмовы работы (55%), «Працаваць на паспяховым прадпрыемстве» (43%) і «Мець прэстыжную работу» (43%).

61% навучэнцаў упэўнены, што іх прафесія запатрабавана на рынку працы, а 28,5% апытаных адказалі менш упэўнена: «Хутчэй за ўсё, запатрабавана».

Жыццёвыя перспектывы

Амаль 87% навучэнцаў паведаміла, што для іх важна мець добрую прафесію. А вось на пытанне «Ці будзеце вы пасля заканчэння навучання працаваць па атрыманай прафесіі?» сцвярджальны адказ далі толькі 34% рэспандэнтаў. І 33% адказалі «Хутчэй за ўсё, буду». Пры гэтым 54% навучэнцаў ужо мелі на той момант на прыкмеце канкрэтнае месца работы.

Цікава, што на пытанне «Як вы ацэньваеце свае шанцы на тое, каб замацавацца ў жыцці?» 21% маладых людзей адказаў, што іх шанцы дастаткова высокія, а 54% лічаць, што «шанцы ёсць, але ўсё залежыць ад мяне». Увогуле не задумваліся над гэтым пытаннем 20,6% апытаных. І зусім не бачыць перспектыў для сябе толькі менш за 1% навучэнцаў прафэхустаноў. Лічаць, што ў іх больш магчымасцяў жыць лепш, чым іх бацькі, больш як 70% рэспандэнтаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«На пытанне «Што для вас найбольш важна ў будучай рабоце?» больш як 66% навучэнцаў на першае месца паставіла адказ «Зарабляць шмат грошай»

«Што трэба для таго, каб стаць сапраўдным прафесіяналам?» — цікавіліся сацыёлагі. «Вялікае жаданне» — так адказалі 67% апытаных. «Працалюбства, упартасць» — 62%. «Добрыя ўмовы для вучобы» — 30,5%. «Добрыя выкладчыкі» — 29%. «Добрая спецыяльная падрыхтоўка» — 26%. «Шмат працаваць» — 25%. «Добрае здароўе» — 17,4%.

Навучэнцам прафэхустаноў таксама было прапанавана ацаніць узровень выкладання ў іх навучальнай установе. 49% ацанілі яго як высокі, і столькі ж — як сярэдні. 36% маладых людзей адназначна б параілі сваім знаёмым паступаць у сваю навучальную ўстанову, і яшчэ каля 30% адказала, што «хутчэй за ўсё, параілі б».

«Камера захоўвання» для няўдачнікаў?

— Пагрозу «Будзеш дрэнна вучыцца, пойдзеш у ПТВ», — чулі многія пакаленні тых, хто вырас у Савецкім Саюзе. Але і на сёння, на нашу думку, **самая вялікая праблема — гэта недастатковая прывабнасць прафесійна-тэхнічнай адукацыі,** — падкрэсліў Сяргей Мусіенка. — Мы пацікавіліся меркаваннем маладых людзей, якія навучаюцца ў прафтэхустановах, якія, на іх думку, меркаванні людзей варта было б абвергнуць. І, мяркуючы па адказах, гэтае пытанне зачапіла іх за жывое: «Тут вучацца тупыя, дурныя, слабыя», «Гэта дрэнная адукацыя», «Тут непрэстыжна вучыцца», «Гэта «хабза». Калі аналагічныя адказы даюць маладыя людзі ў розных рэгіёнах краіны, то адмаўляць існаванне праблемы, напэўна, нельга.

А на адкрытае пытанне «Якія меры варта прыняць для павышэння аўтарытэту прафэхадукацыі?» навучэнцы далі аж 87(!) варыянтаў адказаў. На першае месца яны паставілі працаўладкаванне выпускнікоў. Згадваліся таксама наяўнасць у прафтэхустановах сучаснага абсталявання і ўкараненне новых тэхналогій. Не забыліся навучэнцы і пра заробкі сваіх выкладчыкаў: па іх меркаванні, павысіць аўтарытэт усёй сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі дапамог бы і больш высокі ўзровень аплаты працы выкладчыкаў. Гэты адказ аказаўся на пятым месцы.

— На жаль, памылковых меркаванняў аб сістэме прафэхадукацыі яшчэ хапае. Але аптымізму ў навучэнцаў відавочна больш, чым было яшчэ пяць—дзесяць гадоў таму, — лічыць Сяргей Мусіенка. — Незалежна ад таго, будуць яны паступаць на больш высокую ступень навучання альбо пойдуць працаваць, наяўнасць рабочай прафесіі маладыя людзі ацэньваюць як карысць для далейшага жыцця. І, што вельмі важна, у іх правільна сфарміравана разуменне прафесіяналізму.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«На адкрытае пытанне «Якія меры варта прыняць для павышэння аўтарытэту прафэхадукацыі?» навучэнцы далі аж 87(!) варыянтаў адказаў»

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ВАКЦЫНУ АД ЧУМЫ СВІНЕЙ НАМ ПАСТАВІЦЬ ЛАТВІЯ

Для правядзення імунізацыі дзікоў на тэрыторыі Беларусі адпаведную вакцыну супраць класічнай чумы свіней нашай краіне паставіць Латвія.

Такое рашэнне прадугледжана пастановай Саўміна ад 26 ліпеня 2013 года № 660.

У адпаведнасці з гэтым дакументам, Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі і харчова-ветэрынарная служба Латвіі павінны падпісаць дагавор, згодна з якім Латвія прадаставіць нашай краіне вакцыну супраць класічнай чумы свіней для правядзення імунізацыі дзікіх кабаноў на тэрыторыі Беларусі ў 2013 годзе.

Сяргей ПАЛІНІН.

НА КАНТРОЛІ СВОЕЧАСОВАЯ ВЫПЛАТА ЗАРОБКУ

12 суб'ектаў гаспадарання Гомельскай вобласці дапусцілі парушэнне тэрмінаў выплаты заработнай платы. Як паведамілі ў Камітэце дзяржкантролю Гомельскай вобласці, 10 з іх адносяцца да аграпрамысловага комплексу і 2 — бытавага абслугоўвання.

Так, заработная плата за май працаўнікам таварыства «Жгунское» Добрушскага раёна ў суме Br561 млн была выплачана з затрымкай на 7 дзён, працаўнікам прадпрыемства «Церахоўка-Агра» таго ж раёна — у суме Br790 млн — на 9 дзён. Між тым, нясвоечасовая выплата заработнай платы стварае ўмовы для нясвоечасовых разлікаў грамадзян за аказаныя ім камунальныя паслугі, зніжэння тавараабароту, няпоўнага паступлення планавых падаткаў і збораў.

Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці сёлета за парушэнне тэрмінаў выплаты заработнай платы прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці 6 юрыдычных асоб на суму Br30 млн і 6 службовых асоб на суму Br6,8 млн. Гомельскім абласным упраўленнем Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь прыцягнуты да адказнасці 4 юрыдычныя асобы на суму Br5,3 млн і 10 службовых асоб на суму Br6,7 млн.

ДВА ПАРУШЭННІ Ў АДНЫМ ПОЕЗДЗЕ

У пункце пропуску «Церахоўка» пры правядзенні мытнага кантролю ў пасажырскім цягніку паведамленнем «Днепрапятроўск—Санкт-Пецярбург», у адной з прыбіральняў вагона № 9 было выяўлена прыстасаванне для курэння, зробленае з пластыкавай бутэлькі, а ў дарожнай сумцы аднаго з грамадзян Украіны — папяровы скрутак з рэчывам расліннага паходжання зялёнага колеру.

Са слоў гаспадара багажу, у пакеце знаходзілася марыхуана. Праведзена экспертыза, па выніках якой заведзена крымінальная справа па артыкуле аб кантрабандзе.

У прэс-групе Гомельскай мытні паведамілі, што адначасова ў вагоне № 2 правадніку было прапанавана зрабіць мытнае дэклараванне тавараў, якія ён перамяшчае. Пасля таго, як была зафіксавана адмова, падчас правядзення мытнага агляду былі выяўлены сукенкі, жакеты, спадніцы, штаны, гарнітуры, блузкі, халаты і іншыя прадметы адзення ў колькасці звыш 50 штук коштам больш за Br25 млн. Установлена, што тавар не прызначаўся для асабістага карыстання, а перавозіўся з мэтай рэалізацыі на тэрыторыі Мытнага саюза. Рэчы канфіскаваны. Распачаты адміністрацыйны працэс.

ЗАНАДТА ДАРАГІЯ ЛЕКІ

48-гадовая фармацэўт адной з гомельскіх аптэк папрасіла знаёмую ўрача-тэрапеўта адной з паліклінік Гомеля выпісаць рэцэпт на «Рэліум», які з'яўляецца псіхатропным рэчывам.

Гэтыя моцнадзейныя лекі, што адносяцца да групы транквілізатараў, прызначаліся для знаёмай — загадчыцы склада аднаго з універсамаў, якая выкупіла іх там жа, у аптэцы, за 8700 рублёў. Ва ўпакоўцы знаходзілася дваццаць таблетак дазіроўкай па 5 мг кожная. У выніку раённым аддзелам Следчага камітэта ў дачыненні да фармацэўта заведзена крымінальная справа за незаконны збыт наркатычных сродкаў у буйным памеры. За што прадугледжана пакаранне — пазбаўленне волі на тэрмін ад васьмі да трынаццаці гадоў. І нават канфіскацыю маёмасці.

Прэс-служба УУС Гомельскага аблвыканкама папярэджвае: перш чым «дапамагчы» знаёмым, падумайце пра магчымыя наступствы такой сітуацыі для сябе.

ДЗЕЦІ ЗАГІНУЛІ ПАД ПЯСКОМ

Дзве дзяўчынкі ва ўзросце 10 і 12 гадоў адпачывалі ў сваіх агульных бабулі і дзядулі ў вёсцы Рудня-Марымонава Гомельскага раёна. 30 ліпеня пасля абеду яны пайшлі гуляць на пясчаны насып, які знаходзіцца за кіламетр ад населенага пункта. Калі бліжэй да вечара юныя гамяльчанкі не вярнуліся дадому, сваякі пайшлі іх шукаць.

Дзядуля і дзядзька выйшлі да яру, дзе ўбачылі дзве ямкі ў пяску і грунт, які нядаўна абсыпаўся. Целы дзяўчынак былі засыпаны пяском, звонку засталіся толькі ножкі. Як паведаміла афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Марыя Крываногава, Гомельскі раённы аддзел СК праводзіць праверку па факце смерці дзвюх непаўналетніх, прызначана судова-медыцынская экспертыза.

Дарэчы, летась у Гомельскай вобласці пяць дзяцей загінулі па прычыне абвальвання грунту: два хлопчыкі ў вёсцы Залатуха Калінкавіцкага і тры — у вёсцы Звяняцкае Хойніцкага раёна. Супрацоўнікі Следчага камітэта звяртаюць увагу бацькоў на неабходнасць пільна сачыць за тым, якія месцы іх дзеці выбіраюць для сваіх небяспечных гульняў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

КАНТРАБАНДНЫЯ АЙФОНЫ НА 1,8 млрд

Віцебскія мытнікі канфіскавалі буйную партыю дарагіх айфонаў агульным коштам звыш 1,8 мільярда рублёў, і гэта толькі па папярэдняй ацэнцы.

За гарадскім пасёлкам Лёзна супрацоўнікамі аператыўна-пошукавага аддзела Віцебскай мытні быў прыпынены рух аўто «Таёта», што ехаў у напрамку Расіі. У багажным аддзяленні аўтамабіля яны знайшлі 274 дарагія мабільныя тэлефоны. Кіроўца транспартнага сродку — грамадзянін Беларусі не змог прад'явіць на тавар якіх-небудзь дакументаў.

Айфоны, паколькі яны незаконна перавозіліся па тэрыторыі Мытнага саюза, канфіскавалі.

КАНФІСКАВАНЫ ЦЫГАРЭТЫ НА 36,5 млн

Супрацоўнікі Віцебскай мытні ў грузавым цягніку пад вугалем на рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Бігосава-2» знайшлі буйную партыю кантрабандных цыгарэт.

Як паведамілі ў аддзеле ідэалагічнай працы Віцебскай мытні, у двух паўвагонах пад верхнім пластом вугалю былі знойдзены цыгарэты марак «Прэм'ер» і «NZ Gold» — усяго 7,5 тысячы пачкаў. Цыгарэты беларускай вытворчасці, маркіраваныя акцызнымі маркамі Рэспублікі Беларусь, на агульную суму больш за 36,8 мільёна рублёў канфіскаваны.

КРАЎ ЦУКАР ВАГОНАМІ

У Віцебску пастаўлена кропка ў расследаванні гучнай «цукровай» справы.

Паводле слоў Дзмітрыя Мяргур'ева, пракурора аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства ўпраўленнем Следчага камітэта па Віцебскай вобласці, бізнесмен, які кіраваў фірмай, украў амаль 127 тон цукру, які належаў Слуцкаму цукроварафінаднаму камбінату.

Падчас следства было высветлена, што гэты цукар, агульным коштам больш як 345 мільёнаў рублёў, быў рэалізаваны іншай фірме без пісьмовага ўзгаднення з камбінатам. Грошай за тавар на камбінаце так і не дачакаліся.

«Дзелавы» чалавек асуджаны за прысваенне і растрату да 4 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах ўзмоцненага рэжыму. У асуджанага канфіскавалі маёмасць і пазбавілі права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых функцый тэрмінам на 3 гады. На карысць прадпрыемства спагнана прычыненая шкода — 912 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

1 жніўня 2013 г. № 13 (311)

НАША АСЯРОДДЗЕ

КАЛІ ДРЭВЫ СТАЛІ ВЯЛІКІМІ...

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Дом № 36, што па вуліцы Янкі Маўра ў Мінску, засяляўся ў 1972 годзе. Навасёлы шмат папрацавалі над упарадкаваннем свайго двара: хтосьці пасадзіў кусты, а нехта дрэвы: таполі, ліпы, бярозкі. Словам, кожны зрабіў свой унёсак у агульную справу. І ніхто тады не задумваўся, што з цягам часу дрэвы стануць вялікімі... і прынясуць не толькі прыемную прахалоду ў летнюю спякоту, але і нязручнасці.

— Мы тэлефанавалі ў жыллёва-эксплуатацыйную службу № 48 унітарнага прадпрыемства жыллёва-эксплуатацыйнага рамонтнага аб'яднання № 1 Фрунзенскага раёна, якое абслугоўвае тэрыторыю, дзе знаходзіцца наш дом. Прасілі, каб зрэзалі раскідзістыя дрэвы, што растуць пад самымі вокнамі. Але да гэтага часу ніякай рэакцыі на наш зварот няма, — патэлефанавалі ў рэдакцыю газеты мясцовыя насельнікі.

У двары дома сустракаю жанчыну.

— Вы тут жывяце? — звяртаюся да яе.

— Так, тут, з 1972 года, — адказвае яна.

— А што скажаце наконт дрэў? — цікаўлюся ў сваёй новай знаёмай, Галіны Рабацэвіч.

— А што тут скажаш, святло ў кватэру не прапускаюць. Бачыце, выцягнуліся аж да пятага паверха. У нашым доме жывуць дзве нямоглыя бабулькі, якія рэдка выходзяць на вуліцу. Калі іх наведваю, то пастаянна скардзяцца на вільгаць у кватэрах. На адваротным баку дома таксама шмат ценю і мала сонца. Некалькі гадоў таму адзін з мужчын спрабаваў зрэзаць дрэва, якое вельмі перашкаджала, дык сарваўся з вершаліны, разбіўся. На мой погляд, трэба прарэдзіць пасадкі, спілаваць дрэвы хаця б праз адно. Мне здаецца, што нашаму дому жыллёва-камунальная служба не надае належнай увагі. Колькі гадоў таму, праўда, правялі капітальны рамонт, дарожкі ў двары выклалі тратуарнай пліткай. Але работы выканалі няякасна — плітка правальваецца. Старыя спатыкаюцца, а малыя насы разбіваюць. Мой сусед звяртаўся ў ЖЭС, маўляў, прывязіце пяску, я сам выпраўлю хібы — ніякай рэакцыі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)



РЫСЫ ДА ПАРТРЭТА

УЖО ТРЭЦЯЕ ПАКАЛЕННЕ СТАЛЕЕ НА ЯГО ВАЧАХ

Іван Міхайлавіч Скрыпцоў узначальвае Баркалабаўскі сельсавет, што ў Быхаўскім раёне, з 2007 года. Старшыня ведае тут усіх, любіць свае мясціны і лічыць, што прызначэнне мясцовай улады — працаваць з людзьмі.

Жыццё ў Баркалабаве

Іван Міхайлавіч — чалавек спакойны і разважлівы. Ён не мае жадання да перамены месцаў работы. У яго працоўнай кніжцы ўсяго некалькі запісаў. Пасля заканчэння сельскагаспадарчай акадэміі ён атрымаў размеркаванне ў Быхаўскі раён: працаваў у адной з гаспадарак галоўным інжынерам, а потым паехаў у Баркалабава і ўзначаліў мясцовы калгас імя Карла Лібкнехта.

— Наколькі я ведаю, менавіта ў Баркалабаве быў створаны першы на Быхаўшчыне сельсавет і ўзнікла першая камуна, — расказвае Іван Міхайлавіч. — Прычым па дэкрэце Леніна тут атрымалі першы трактар, і я яшчэ, калі прыехаў працаваць сюды, заспеў жывым таго дзеда, які быў на ім першым трактарыстам!

Сам Скрыпцоў — ураджэнец Дрыбінскага раёна.

— У маёй роднай вёсцы Вярба, калі я з'язджаў у «вялікае жыццё», было больш за 70 двароў, — расказвае ён. — А цяпер засталіся «жывымі» толькі некалькі хат.

Такі лёс наўрад ці напаткае аграгарадок Баркалабава і яго навакольле. Людзей прываблівае старажытная гісторыя гэтых мясцін, маляўнічая прырода, сучасная інфраструктура, а таксама і невялікая адлегласць ад абласнога цэнтра. Трыццаць кіламетраў для аўтааматара — зусім не адлегласць, і таму невыпадкова, што сельсавет масава акупавалі дачнікі — тут «нарэзалі» 900 участкаў пад лецішчы.

— Баркалабава — гэта сапраўды добрае месца для жыцця, — пацвярджае Скрыпцоў. — Ёсць чыгунка і аўтамабільныя дарогі, водаправод. Нядаўна правялі прыродны газ. Калі я працаваў старшынёй калгаса, мы шмат рабілі для таго, каб палепшыць умовы жыцця людзей. Цяпер, калі я працую ў сельсавеце, амаль няма скаргаў па праблемах вады, дарог, іншых выгод.

Шукаць кансэнсус

На тэрыторыі Баркалабаўскага сельсавета 9 вёсак і адна чыгуначная станцыя. Колькасць насельніцтва — каля 900 чалавек.

— Я тут жыву даўно і абсалютна ўсіх жыхароў ведаю, — гаворыць старшыня. — Ужо трэцяе тутэйшае пакаленне сталее на маіх вачах. Але я не з тых, хто лічыць, што ў наш час кіпень быў больш смачны, і не скарджуся на моладзь. Мне, наадварот, падаецца, што цяперашнія маладыя людзі лепшыя — больш разумныя за нас, не такія наіўныя.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ШАНЦ ПАЧАЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Старшыні Светлагорскага райсавета Рыгору Мурашку даводзіцца вырашаць сёння розныя праблемы, прычым часам тэрмінова, асабліва калі людзі звяртаюцца па дапамогу.

— Добраўпарадкаванне вёскі, знос старых дамоў — адна з самых балючых тэм...

— Гэта складаная работа, але ж займаемся ёю сур'ёзна. Грошы выдзяляе абласны бюджэт. На сённяшні дзень па плане першага паўгоддзя знесена каля 120 дамоў. За другое трэба знесці яшчэ 122 дамы — гэтыя работы каштуюць прыкладна 480 млн рублёў. Вось стаіць дом пасярэдзіне вёскі. Нарэшце знеслі яго, закапалі. А пад што прыстасаваць гэтую зямлю? Лес пасадзіць? Цень будзе перашкаджаць суседнім агародам. Пад сельгасугоддзі аддаць мясцовай гаспадарцы не атрымліваецца, бо трактарам туды не заехаць, зямлю не апрацаваць. Вядома, зараўноўваем гэтыя ўчасткі, але ж эфект эканамічны ад гэтага невялікі. Добра там, дзе агароды прымыкаюць да сельгасугоддзяў. Тады яны далучаюцца да калгаснага поля. Пасярод вуліцы зносім таксама, але ж імкнёмся прапаноўваць такія ўчасткі людзям, каб там сеялі бульбу ці жыта. Часам не хапае тэхнікі. У нас жа практычна няма спецыялізаваных арганізацый, якія б займаліся зносам дамоў, таму прыцягваем ПМС, КЖУП «Светач», ПМК-72. Ёсць складанасці, але ж мы вырашаем гэтыя пытанні.

— Рыгор Кузьміч, сярод жыхароў раёна ёсць няхай і невялікая, але ж самая складаная катэгорыя насельніцтва — сацыяльна небяспечныя. З імі як працуеце?

— Мы арганізавалі рабочыя групы ў складзе намесніка старшыні райвыканкама, кіраўніка справамі, пракурора, начальніка міліцыі, начальніка МНС, удзельнічае таксама служба занятасці, рэдакцыя мясцовай газеты, ідэалогія, адукацыя... Прадстаўнікі гэтых структур працуюць у сельскіх Саветах. Збіраем людзей, якія ўваходзяць у групу рызыкі. Абавязкова кіраўніка мясцовай гаспадаркі запрашаем на такую сустрэчу. Размаўляем з чалавекам, а таксама прапануем яму працу. І адразу ж на машыне вязём у бальніцу на медагляд, праз два дні ўладкоўваем на працу: каго даглядчыкам жывёлы, каго дворнікам... Такім чынам мы праводзім працу з гэтымі людзьмі па ўсіх сельскіх Саветах. Мы прымаем канкрэтнае рашэнне па кожным асобным чалавеку, даём яшчэ шанц пачаць новае жыццё. Старшыні сельсаветаў могуць пацвердзіць: ёсць прыклады, калі некаторых людзей атрымалася «выцягнуць», яны сталі працаваць, у іх сёння нармальныя сем'і.

— Як вы лічыце, якая роля мясцовых Саветаў у сучасных умовах? Былі ж меркаванні, што яны не вельмі патрэбны?

— Мой пункт гледжання такі: сёння сельсаветы патрэбны. Яны — рэальная апора ўсёй вертыкалі ўлады. Гэта магчымасць лепш ведаць усе праблемы людзей. Я прыязджаю ў вёску, іду да загадчыцы крамы, якая з'яўляецца і дэпутатам сельсавета, і памочнікам старшыні сельвыканкама. Яна мне сітуацыю дакладна выкладвае па ўсёй вёсцы. Часам вельмі цяжка сабраць на сход жыхароў усёй вёскі, нават калі яна невялікая. А праз дэпутата пра ўсё можна даведацца: як жыве канкрэтная бабулька, якія ў яе ўзаемаадносіны з дзецьмі, калі яны прыязджаюць да маці: у дзень пенсіі ці незалежна ад гэтага. Сельсаветы — гэта рэальныя каналы для правядзення дзяржаўнай палітыкі на вёсцы. Тым больш што выбіраюць у дэпутаты заўсёды лепшых. Таму я ўпэўнены, што на гэтым этапе фарміравання нашага грамадства гэтую структуру трэба абавязкова захаваць.

ПЫТАННЕ РУБАМ

ЛЯХАВІЧАМ ПАТРЭБЕН НЭП,

што значыць Навядзенне Элементарнага Парадку

Ляхавіцкі раён мае добры патэнцыял — людскі, зямельны, прамысловы, але вынікі працы гэтага года сумныя. Раён трапіў у вобласці ў аўтсайдары, прычым па ўсіх напрамках. «Спад у развіцці насамрэч ёсць, — адзначыў губернатар Брэстчыны Канстанцін Сумар. — Прычынай таму бачу нізкую адказнасць і выканальніцкую дысцыпліну, дрэннае кіраўніцтва».

Кіраўнік рэгіёна не скупіўся на ацэнкі, называў і вінаватых, з яго пункту гледжання. Першым трапіў у чорны спіс старшыня райсавета Яўген Юрлевіч. Канстанцін Сумар менавіта яму паставіў у віну той факт, што ў раёне паміж кіраўнікамі няма паразумення настолькі, што папаўзлі ўніз эканамічныя паказчыкі, не выконваецца даручэнне Прэзідэнта па ўводзе ў дзеянне сучасных жывёлагадоўчых комплексаў.

— Заняпалая ферма не можа быць месцам працы сучаснага чалавека, моладзь туды не пойдзе, нават не спадзявайцеся, — гэта быў камень у агарод вядомага не толькі ў раёне і вобласці, але і ў рэспубліцы кіраўніка-аграрыя Віталя Бусько. — Я ведаю, вы ўмееце і любіце працаваць, вашы ўраджаі збожжавых б'юць рэкорды ў краіне, але чаму такое стаўленне да жывёлагадоўлі? З выдзеленых на рэканструкцыю фермаў сродкаў вы не здолелі да гэтага часу асвоіць нават трэцяй часткі. Аналагічнае становішча і ў іншых гаспадарках. Калі на працягу паўгода сітуацыя не зменіцца, некаторым давядзецца расстацца з пасадамі.

«Канёк» раёна — сельская гаспадарка. Так было заўсёды і так павінна застацца, але сёння сітуацыя блізкая да калапсу: назіраецца ўстойлівае падзенне надояў і прыбавак у вазе, рэалізацыя жывёлы рэзка знізілася, валавы аб'ём прадукцыі сельскай гаспадаркі складае ўсяго 96%, рэнтабельнасць малака — толькі 4,3%, хоць па вобласці звыш 12, у чатырох СВК малако і зусім стратнае. «Так працаваць трэба ўмець!» — абураўся Канстанцін Сумар. У васьмі гаспадарках існуюць страты ад рэалізацыі мяса, што таксама больш чым парадаксальна. Выручка на аднаго працаўніка складае 5,7 тыс. долараў (па вобласці 7), 5 з 12 гаспадарак не дасягнулі і гэтага паказчыка, ёсць СВК, дзе яна толькі 3 тыс. долараў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

БЛІСКУЧАЯ ПРАЦА...

пра дзейнасць органаў самакіравання

Фонд старадрукаваных і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь налічвае больш як 70 тысяч экзэмпляраў, валодаючы пры гэтым літаратурай, якая закранае пытанні ўзнікнення і развіцця мясцовага кіравання і самакіравання ў розных краінах свету.

Адна з найцікавейшых работ — «Новейшія теченія въ англійскомъ городскомъ самоуправленіи» (1898 г.), аўтарам якой з'яўляецца нямецкі палітык Гуга Ліндэман, які выдаваў некаторыя свае работы пад псеўданімам К. Гуга, адзін з лепшых у Германіі знаўцаў пытанняў муніцыпальнага кіравання і самакіравання.

...Англія, канец XIX стагоддзя. У выніку бурнага развіцця прамысловай вытворчасці і імклівага прыросту гарадскіх жыхароў востра паўстала пытанне аб стварэнні здаровых умоў жыцця для іх насельніцтва, паколькі гарадская гігіена — пачынаючы ад жылля насельніцтва і да пахавання нябожчыкаў, ад забеспячэння вадой да правядзення сцёкавых каналаў, ад добраўпарадкавання базараў да нагляду за хлебапякарнямі — адносіцца да кола дзейнасці гарадскога кіравання. Непазбежна ўзнікла неабходнасць не толькі арганізацыі сеткі шырокіх вуліц, пастаяннага правядзення новых шляхоў зносін, але і павышэння разумовай адукацыі гараджан: стварэння і ўтрымання тэхнічных школ, народных бібліятэк, музеяў, карцінных галерэй і г.д.

Паспяховае вырашэнне пытанняў развіцця гарадской гігіены пачынаецца толькі ў другой палове XIX стагоддзя, паколькі раней у гэтай галіне панавалі абыякавасць і нядбайнасць, і толькі хуткае і паўсюднае распаўсюджванне страшных эпідэмій абудзіла ў людзях сумленне і страх. Менавіта ў гэты перыяд робяцца дзейсныя захады і з'яўляецца дакладнае разуменне задач гарадскога кіравання. Аднак першапачаткова за задавальненне патрэб гарадскога насельніцтва бяруцца прыватныя прадпрымальнікі, асноўнай мэтай якіх з'яўляецца толькі асабістая выгада. У далейшым становіцца відавочным, што яны не здольны прынесці якую-небудзь значную карысць грамадству, і гарадскія ўпраўленні паступова падпарадкоўваюць іх свайму ўплыву. Крок за крокам гарадское самакіраванне выцясняе прыватнае прадпрымальніцтва і паступова накіроўвае ў сваю ўласнасць збудаванні вода- і газазабеспячэння, гарадскія чыгункі, базары, могілкі, лазні, пральні і г.д., паспяхова дамінуючы ва ўсіх сферах задавальнення грамадскіх патрэб. З прыняццем у сваё распараджэнне прыватных прадпрыемстваў сфера іх дзейнасці пашыраецца да неверагодных межаў.

У гэтай кнізе аўтар дэталёва разглядае пералічаныя пытанні на прыкладзе развіцця гарадскога самакіравання як у Лондане, так і ў вялікіх гарадах на поўначы Англіі (а таксама Шатландыі), шмат увагі надае гісторыі і праблемам развіцця муніцыпальнага права.

У кнізе мноства захапляльных гістарычных фактаў. Яна дапоўнена колькаснымі характарыстыкамі, табліцамі, напісана дастаткова простай мовай, дзякуючы чаму з'яўляецца зразумелай і, у нейкім сэнсе, актуальнай нават сёння. Сучаснікі называюць яе «бліскучай працай... пра дзейнасць органаў самакіравання».

Азнаёміцца з гэтым і іншымі выданнямі можна ў чытальнай зале Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

Алена ВІННІКАВА.

АКТУАЛЬНАЯ ТЭМА

МАЛОЧНЫЯ РУЧАІ ПРЫВАТНЫХ СЯДЗІБ

На стале старшыні Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў Віктара Невяровіча сярод іншых папер на відным месцы (як гаворыцца, пад рукой) ляжаць звесткі аб дынаміцы па закупе малака ў раёне. Паказчыкі ўвогуле неблагія, але інфармацыя, нават самая свежая і дакладная, ні ў якім разе не заменіць сустрэч з жыхарамі. Старшыня лічыць, што па-ранейшаму праверaным і надзейным сродкам работы з людзьмі былі і застаюцца нефармальныя размовы, падчас якіх можна шчыра і проста абмеркаваць разам з людзьмі праблемныя пытанні.

У поўдзень статак спыняецца для дойкі ў цені дрэў.

— Я даўно заўважыў: вяскоўцы цэняць менавіта такія гутаркі з прадстаўнікамі мясцовай улады. Таму прапаную наведаць аграгарадок Яхімоўшчыну ў Палачанскім сельсавеце і паглядзець, як там наладжаны збор малака ў сярэдзіне дня. Такая практыка выкарыстоўваецца далёка не ўсюды ў раёне. Яе перавагі ў тым, што жанчынам не трэба пасля дойкі недзе захоўваць малако. Яго адразу забірае індывідуальны прадпрымальнік. А гэта вельмі зручна і выгадна як для людзей, так і для малочнага камбіната, бо малако без прамаруджвання пераліваецца ў спецыяльна абсталяваную для яго перавозу цыстэрну і вельмі аператыўна (праз хвілін 15—20) дастаўляецца на прадпрыемства, — гаворыць Віктар Баляслававіч.

Нам пашанцавала: мы прыехалі якраз у той момант, калі гаспадыні пасля дойкі ў поўдзень здавалі малако 30-гадоваму індывідуальнаму прадпрымальніку Дзмітрыю Алёхіну. Сам ён з Маладзечна. Ужо два гады займаецца гэтай справай. Яго тэрыторыя ахопу — аграгарадкі Яхімоўшчына і Палачаны. Заробак ёсць. Натуральна, размова з гаспадынямі кароў адразу завязалася аб самым надзённым. Апошнім часам пытаннем №1 літаральна для ўсіх малаказдатчыкаў сельсавета стала цана закупу малака ў насельніцтва. Вось і Зоя Фёдараўна Кандратовіч выказвае незадаволенасць цяперашнімі цэнамі. А яна тут, бадай, самы актыўны і пастаянны здатчык малака. Хутка будзе два гады, як яна на пенсіі. Але па-ранейшаму працуе і трымае дзвюх кароў. Гаворыць, што і 30, і 20, 10 гадоў таму, і сёння яе сям'я мае дзвюх рагуль. Цяпер адна, першага ацёлу, дае ў дзень 20 літраў малака. Другой ужо шосты год пайшоў. Яе прадуктыўнасць — каля 23 літраў. Жывёлу даглядаюць разам з мужам, таксама пенсіянерам.

У прадпрымальніка Дзмітрыя АЛЁХІНА працоўны дзень строга распісаны: ён прымае малако.

— Грошы патрэбны, каб дзецям дапамагчы стаць на ногі, — кажа Зоя Фёдараўна.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

КАЛІ ДРЭВЫ СТАЛІ ВЯЛІКІМІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Да нашай размовы падключаюцца і іншыя жыхары. Ніна Данілаўна жыве ў другім пад'ездзе на трэцім паверсе. Вільгаці ў яе кватэры няма, бо паставіла шклопакеты. А наконт дрэў ёй усё роўна: ёсць яны ці не.

Іншай думкі прытрымліваецца Ніна Уладзіміраўна Шыкуць:

— У пакоях як у турме — цёмна, няўтульна. Асабліва не па сабе робіцца, калі моцны вецер на вуліцы: баюся, што шыбы павыбіваюць галіны.

— Мы ўжо самі спрабавалі звесці самыя старыя і разгалістыя дрэвы, пад корань сыпалі атруту, хімікаты: не дапамагло — стаяць, як стаялі, — прызнаюцца жанчыны.

Раіса Станіславаўна наведвае сваю маці.

— У кватэры сапраўды змрочна, вільготна. Дрэвы, якія растуць шчыльна каля дома і не прапускаюць святло ў кватэры, трэба зрэзаць. Тыя, што паводдаль, нікому не перашкаджаюць. Няхай жывуць, радуюць вока, — зазначае яна.

Што скажуць на гэты конт у ЖЭС-48 Фрунзенскага раёна сталіцы? Кіруюся туды. Як сцвярджае галоўны інжынер Алег Галаўко, ніякіх заявак на абрэзку дрэў з дома № 36 пры ім не паступала. Праўда, ён часова замяшчае свайго начальніка, які зараз у адпачынку: можа, да яго і звярталіся жыльцы.

Алег Аляксандравіч паказвае заявы на спілоўку дрэў ад жыхароў дамоў №№ 66, 50, 68 па вуліцы Янкі Маўра, а таксама Адоеўскага, 31 і Бельскага, 61.

— І колькі трэба чакаць пасля падачы заявы, каб дрэвы спілавалі? — высвятляю ў свайго суразмоўцы.

— Справа робіцца па меры выдзялення транспарту ЖРЭА. Патрэбна спецыяльнае абсталяванне, інструмент, бензапіла. Задавальненне, бясспрэчна, нятаннае. Напрыклад, восем гадзін працы вышкі, без якой нельга спілаваць дрэвы, абыходзіцца ў мільён рублёў, — адказвае ён.

Ёсць выпадкі, калі людзі самі ціхенька абразаюць ці спілоўваюць разгалістыя дрэвы, прызнаўся Алег Галаўко. Але гэта незаконна і караецца штрафам. Дрэвамі, што месяцца пры дарогах, у іншых месцах займаецца Мінскзелянбуд і адпаведныя раённыя арганізацыі; тымі, што растуць на дваровых тэрыторыях — ЖЭСы.

— Няхай жыхары дома № 36 звяртаюцца да нас з пісьмовай заяўкай, і мы вырашым праблему, — сказаў у заключэнне галоўны інжынер.

ЛЯХАВІЧАМ ПАТРЭБЕН НЭП

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Хто будзе працаваць у такіх сельгаспрадпрыемствах? — запытаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама і запэўніў, што там у кіраўнікоў няма будучыні.

Рабочых рук у раёне і на самой справе хутка можа не застацца. Паводле статыстычных звестак, больш за 30% насельніцтва Ляхавіччыны ва ўзросце да 50 гадоў не працуюць у раёне. Віной таму нізкая заработная плата не толькі ў аграрным сектары эканомікі, але і ў іншых галінах народнай гаспадаркі. Так, губернатар адзначыў, што ў раёне «кульгае» і гандаль, назіраецца спад прамысловай вытворчасці, ёсць праблемы ў будаўніцтве. Што тычыцца апошняй галіны, то на яе з надзеяй глядзяць не толькі мясцовыя і абласныя чыноўнікі, але і ўсё насельніцтва горада і раёна. Справа ў тым, што гэтай восенню ў Ляхавічах пройдуць абласныя дажынкі, у сувязі з чым горад павінен прыкметна змяніць выгляд. На сённяшні дзень па яго вуліцах складана перасоўвацца — усё раскапана. Жыхары горада з разуменнем да гэтага ставяцца. А вось кіраўнік рэгіёна і тут не ўтрымаўся ад крытыкі і канструктыўных заўваг.

— І што мы робім? Мяняем да лепшага вуліцы, паркі і скверы, пры гэтым дзелім маёмасць на сваю і чужую. Чужым стаў для раённай адміністрацыі будынак інтэрната каледжа. Але ці павінна ведамасная прыналежнасць служыць падставай для таго, каб яго абысці ўвагай? Там жывуць нашы дзеці, якія заўтра прыйдуць працаваць у нашы гаспадаркі, — расставіў акцэнты Канстанцін Андрэевіч.

Губернатар ні ад каго не запатрабаваў справаздачы падчас пасяджэння гаспадарчага актыву раёна, хоць было б дарэчы спытаць у старшыні райвыканкама Дзмітрыя Бурдука, чаму ў раёне склалася такая сітуацыя, чаму паказчыкі папаўзлі ўніз. Але замест яго на гэтыя пытанні адказвалі начальнік міліцыі, ваенкам, дырэктары школ — губернатару быў цікавы іх пункт гледжання. Усе сцвярджалі, што патэнцыял у раёна ёсць, проста трэба больш эфектыўна гаспадарыць. Такога ж пункту гледжання прытрымліваецца і дырэктар Ляхавіцкага малочнага завода Вячаслаў Жукоўскі. Не раз у станоўчым кантэксце гучала падчас пасяджэння прозвішча старшыні СВК «Ляхавіцкі» Аляксандра Вітко. Што датычыцца другога Ляхавіцкага аграрнага «слупа» — Віталя Бусько, то губернатар адзначыў, што на яго трэба раўняцца як на раслінавода, але павучыць працаваць як жывёлавода — комплексы і фермы Віталь Іванавіч не жадае выводзіць на сучасны ўзровень.

Эканамічную сітуацыю ў раёне можна паправіць, патэнцыял і напрацоўкі для гэтага ёсць, а вось нездаровы маральна-псіхалагічны клімат, які склаўся сярод кіраўнікоў, патрабуе ад кожнага, пачынаючы з старшыні райвыканкама, працы (у першую чаргу, над сабой), прызнання сваіх памылак і павагі да навакольных. Ці справіцца з гэтым ляхавіцкі «бамонд»? Пажывём — пабачым.

Паліна ГАЛІЕЎСКАЯ.

УЖО ТРЭЦЯЕ ПАКАЛЕННЕ СТАЛЕЕ НА ЯГО ВАЧАХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Іван Міхайлавіч гаворыць, што праца старшыні сельсавета ў асноўным складаецца са стасункаў з людзьмі, таму яна цікавая, але цяжкая і вельмі адказная.

— На мой погляд, самае галоўнае — паставіць сябе на месца чалавека, які прыйшоў са сваёй праблемай, — дзеліцца вопытам Скрыпцоў. — Табе не проста выпадае добразычліва з ім гутарыць, але менавіта паглядзець на сітуацыю з яго пазіцыі. У такім разе можна пазбегнуць вялікіх памылак.

Да такога стаўлення яго прывучыла калгасная праца. Іван Міхайлавіч узгадвае, што ў 1970-я гады, калі ён стаў кіраваць сельскай гаспадаркай, становішча яе было не самым лепшым.

— Калгас быў абавязаны ўсім арганізацыям, і цяжка было, пакуль не прыдумалі харчовую праграму, — працягвае ён. — Так што трэба было працаваць і выжываць: і людзям заробак плаціць, і з крэдыторамі не пасварыцца. Як казаў Гарбачоў, знаходзіць кансэнсус, шукаць згоду паміж уласным гонарам і патрэбамі людзей. З тых часоў і звычка засталася: не толькі зразумець чалавека, а паставіць сябе на яго месца.

Духоўнае і надзённае

Адна з адвечных славутасцяў гэтых мясцін — велічная рака Днепр, неверагодна прыгожыя краявіды. Цяпер тут проста паломніцтва рыбакоў, асабліва ў выхадныя дні. На ўлоў ніхто не скардзіцца: калі ні зірнеш на людзей з вудамі — нехта цягне шчупака.

На беразе Дняпра, дзе рэчка робіць паварот, размясціўся Свята-Узнясенскі жаночы манастыр, адроджаны на вельмі старажытным месцы. Знакамітыя Баркалабаўскія хронікі былі напісаны якраз тут, шмат стагоддзяў таму. У савецкі час манастыр закрылі і ўрэшце зруйнавалі, а цяпер манашкі адбудоўваюць манастыр нанова.

— Мы ставімся да гэтай справы з разуменнем: наша супрацоўніцтва — з карысцю для абодвух бакоў, — падкрэслівае старшыня сельсавета. — У кожнага з нас, безумоўна, свае задачы, але і яны часам супадаюць. У нас ёсць людзі неўладкаваныя, праблемныя. Ім часам у манастыры даюць разавую працу, каб зарабіць на кавалак хлеба. І пры гэтым яшчэ бласлаўляць ды накажуць, каб віна не піў. І гэта, як ні дзіўна, мае добры ўплыў. Яны слухаюць!

Сельсавет таксама дапамагае манастыру — з тэхнікай для добраўпарадкавання, з арганізацыяй суботнікаў, прыбіраннем тэрыторыі. У манастыр прыязджаюць паломнікі да знакамітага на ўсю Беларусь абраза Баркалабаўскай Божай Маці. А многія, з практычным падыходам, сумяшчаюць наведанне храмаў з наступным адпачынкам у аграэкасядзібах Быхаўскага раёна.

Яблычны сезон

У Баркалабаўскім сельсавеце працуюць старшыня і кіраўнік справамі Надзея Мікалаеўна Данілкіна.

— Нам вельмі дапамагла камп'ютарызацыя, — тлумачыць Іван Міхайлавіч. — Раней кожную паперу трэба было прачытаць ды напісаць, а цяпер «клік-клік» — і ёсць даведка. Так што мы новым сучасным павевам радуемся.

Якімі ж клопатамі цяпер заняты Баркалабаўскі сельсавет? Сезонная навіна: у акрузе прыватныя гаспадары маюць добры ўраджай яблыкаў, і людзі пайшлі ў сельсавет па даведкі, каб здаць вырашчаныя і сабраныя плады на Быхаўскі кансервава-агароднінасушыльны завод.

— Увогуле з рознымі праблемамі даводзіцца разбірацца штодня, — усміхаецца Іван Міхайлавіч. — Сёння паскардзіліся на суседскіх курэй, якія нешта склявалі на агародзе. Тут усё проста, ды і ў сялян канфлікты такога кшталту здараюцца зрэдку. Затое гарадскія (я маю на ўвазе — дачнікаў) часта маюць прэтэнзіі адзін да аднаго. То пчолы замінаюць, то агароджа няправільная, то нехта гучна музыку слухае. Даводзіцца мірыць.

Старшыня савета па-філасофску дадае, што «праблемы былі да нас, пры нас і пасля нас таксама будуць». На яго думку, план дзеянняў тут просты: трэба ў межах духоўных і фізічных сіл дапамагаць людзям.

З уладай надзейна

Добра, калі праблемы людзей ёсць каму вырашаць, калі ёсць да каго звярнуцца, лічаць у Баркалабаве.

— Сельсаветы абавязкова патрэбны, тут і меркаваць няма чаго, — не мае сумненняў Скрыпцоў. — Чалавеку трэба кудысьці-небудзь прытуліцца. Павінен існаваць орган улады на месцы. Можа, працу сельсаветаў трэба ўпарадкаваць: стварыць кодэкс, чым канкрэтны мы павінны займацца. І мне падаецца, што тут самае галоўнае — гэта праца з насельніцтвам, з іх клопатамі і патрэбамі, у тым ліку і з дакументамі. Калі мы не зможам вырашыць, то параду дадзім чалавеку — што рабіць і куды звяртацца. Многім людзям і такая дапамога патрэбна.

Іван Міхайлавіч узгадвае, як у «Паднятай цаліне» Шолахава хадзіў дзед з пячаткай. Можа, вобраз для сучаснасці і ўтрыраваны, адразу заўважае ён, але старшыня сельсавета ўпэўнены, што людзі адчуваюць сябе больш надзейна, калі побач ёсць прадстаўнік улады. Такое меркаванне, гаворыць ён, вяскоўца падтрымліваюць.

— Мае пажаданні людзям, каб яны не хварэлі і былі здаровымі, — кажа Іван Скрыпцоў. — Каб была стабільнасць у сям'і і грамадстве. І каб паміж людзьмі было паразуменне.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Быхаўскі раён.

МАЛОЧНЫЯ РУЧАІ ПРЫВАТНЫХ СЯДЗІБ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Нагадаем, з сакавіка мінулага года дзейнічае закупачная цана малака ад насельніцтва — 2555 рублёў за адзін літр. Сёлета ў лютым была ўведзена надбаўка па 110 рублёў за 1 л. Цяпер малаказдатчык атрымлівае 2665 рублёў за літр. Дарэчы, малочнаму камбінату гэтае малако абыходзіцца ўжо ў 3066 рублёў.

Пытаемся: маўляў, а якая цана, на ваш погляд, была б прымальнай? Меркаванні жанчын не вельмі адрозніваліся: хоць бы 3500 —4000 рублёў за 1 л, бо на гарадскім базары за літр просяць 7000 рублёў. Між іншым, і малаказборшчык Дзмітрый Алёхін таксама за павышэнне закупачных цэн на малако ў насельніцтва. Яго засмучае, што з кожным годам становіцца менш кароў у вяскоўцаў. Значыць, змяншаюцца аб'ёмы перавозкі малака, ад чаго залежаць яго заробкі. Логіка Дзмітрыя простая: вышэй цэны — больш будуць здаваць малака дзяржаве. А то нямала вяскоўцаў лічаць выгадным лепш прадаваць яго дачнікам.

Якасныя кармы — таксама даволі вострае пытанне для жыхароў Яхімоўшчыны. Не хапае плошчаў для нарыхтовак сена, выгану для жывёлы. І не толькі ў гэтым сельсавеце. Дарэчы, з гэтай нагоды летась у раёне ўдалося палепшыць 743 га пашы.

Наша размова прадоўжылася ў Палачанскім сельсавеце. Яго старшыня Уладзімір Станкевіч гаворыць, што сваю станоўчую ролю адыгрывае спаборніцтва ў раёне па закупе малака і маладняку буйной рагатай жывёлы ў насельніцтва. Яно разгорнута ў рамках зацверджанай райсаветам раённай праграмы па развіцці і падтрымцы асабістых падсобных гаспадарак на 2011—2015 г. г. У спаборніцтве ўдзельнічаюць і выканкамы сельсаветаў. Для іх старшынь, якія па выніках года дасягнулі лепшых вынікаў, вызначаны тры грашовыя прэміі. Першая — 12 базавых велічынь, другая — 11, трэцяя — 10 базавых велічынь. Акрамя пераможцаў, заахвочвальнымі прэміямі (5 базавых велічынь) узнагароджваюцца старшыні выканкамаў сельсаветаў, якія забяспечылі за год закуп малака ад адной каровы звыш 1500 кг. Спаборніцтвам ахоплены малаказборшчыкі і малаказдатчыкі. Яны за лепшыя вынікі таксама матэрыяльна заахвочваюцца. Між іншым, памер прэмій старшыням выканкамаў сельсаветаў і малаказборшчыкам можа быць зніжаны ў выпадку здачы малака з павышанай кіслотнасцю і тлустасцю ніжэй за базісны паказчык.

У аграгарадок Яхімоўшчына прыбыла машына для збору малака. У гэты ж час сюды завітаў старшыня Маладзечанскага райсавета, каб пагутарыць з вяскоўцамі пра іх надзённыя праблемы.

Старшыня райсавета не згодны з тымі, хто сцвярджае, што вяскоўцы страчваюць жаданне ўвогуле трымаць хатнюю жывёлу. Ён прыводзіць цікавую статыстыку: у параўнанні з мінулым годам колькасць кароў у прыватным сектары раёна зменшылася на 126 галоў, а вось авечак стала больш на 130 галоў, іх колькасць працягвае расці. Пагалоўе птушкі, коз і свіней захоўваецца на ранейшым узроўні. Ці значыць гэта, што карова на падворку не патрэбна?

— Не! — упэўнены Уладзімір Станкевіч.

Паводле яго слоў, карову ў вёсцы трымаць выгадна. Яна ж карміцелька!

— Паглядзіце, малочныя прадукты ў магазіне дарагія. Таму карова дазваляе істотна эканоміць сямейны бюджэт, бо можна вырабляць смятану, тварог, сметанковае масла. Па-другое, выгадна трымаць пару парсючкоў, калі маеш карову. Ім можна даваць сыроватку, адстойнае малако — ад гэтага мяса і сала толькі больш смачным становіцца. Праверана на сабе. Мы з жонкай адразу пасля вяселля завялі карову і трымалі жывёлу амаль 30 гадоў. Яна нам моцна дапамагала. Потым вымушаны былі адмовіцца: цяжкавата стала яе даглядаць, — гаворыць Уладзімір Пятровіч. Хаця, з іншага боку, ён бачыць цяжкасці ўтрымання каровы на падворку для гаспадыні: трэба рана прачынацца для дойкі, потым бегчы на работу, затым зноў у абед дадому на чарговую дойку. І так без выхадных і прахадных. А яшчэ карову трэба і пакарміць, і напаіць, і рэгулярна паказваць ветэрынару, берагчы зімой, не забываць выкідваць гной. Усё гэта вялікі клопат. Таму не кожная маладая сям'я рашаецца завесці карову.

Адзін з лепшых здатчыкаў малака — вартаўнік Зоя КАНДРАТОВІЧ.

Хто ведае, можа, дзякуючы выдатнай прапагандысцкай рабоце Уладзіміра Пятровіча (ён старшынёй Палачанскага сельсавета працуе ўжо 19 гадоў) на яго тэрыторыі самая вялікая колькасць кароў сярод іншых сельскіх Саветаў — 197. Таму пытаемся ў яго: як зацікавіць маладыя сем'і на вёсцы завесці карову?

— Складанае пытанне. Я думаю, што маладыя жанчыны ў дэкрэтным адпачынку маглі б дазволіць сабе ўтрымліваць карову. Не выключаю іншыя сітуацыі, калі мець карову было б вельмі выгадна. Скажам, калі муж і жонка працуюць надомнікамі, выконваюць заказы. Але я салідарны з нашымі вяскоўцамі: для гэтага трэба ўзняць закупачныя цэны на малако.

Віктар Баляслававіч тлумачыць, што ў цэлым у раёне адладжана сістэма аплаты за здадзенае малако. Большасць вяскоўцаў атрымлівае грошы на пошце, астатнія праз аддзяленне Беларусбанка. Частка з іх аддае перавагу пластыкавым банкаўскім карткам.

Летась на мясцовы малочны камбінат намаганнямі насельніцтва было пастаўлена 7% ад усяго аб'ёму нарыхтовак малака ў раёне. Зразумела, не малочная рака, а толькі ручай. Але, тым не менш, гэта 2 284,8 тоны малака. Яго збор у раёне вядуць індывідуальныя прадпрымальнікі, прычым у кожнага з іх — свая тэрыторыя. Яны рэгулярна здаюць малако на аналіз у лабараторыю камбіната. Гэтая мера дазволіла павысіць якасць малака — у прыватнасці, узрасла яго тлустасць. І што цікава, пры змяншэнні прыватнага дойнага статка выраслі і колькасныя паказчыкі. Калі на 1 ліпеня 2010 года закуп малака ў сярэднім на адну прыватную карову склаў 663 кг, то на 1 ліпеня 2013 года — 764 кг. Значыць, цяперашняя сярэднестатыстычная карова дае на 101 кг больш. Вядома, гэты паказчык далёка не рэкордны, але ён сведчыць аб рэзервах асабістых падсобных гаспадарак.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.
Маладзечанскі раён.

СІТУАЦЫЯ

«НЯЎЖО ПРЫЙДЗЕЦЦА ЗБЫВАЦЬ КАРМІЦЕЛЬКУ?»

альбо Чаму «скача» тлустасць малака

З гэтай праблемай у рэдакцыю звярнулася наша чытачка Галіна Пятроўская з вёскі Ардашы Смаргонскага раёна. Яна піша, што тлустасць малака «кульгае» на абедзве нагі, паказчыкі значна ніжэйшыя, чым летась. Год таму ў чэрвені было 3,4 %, у ліпені — 3,6 %, а зараз — 3,1 %. «Хто ж гэта нас так абкрадае? ...Б'юць па працавітых руках вяскоўцаў, адымаюць зацікаўленасць у здачы малака. Няўжо прыйдзецца збываць карміцельку? А мы ж яе з цялятка выгадавалі» — занепакоена Галіна Васільеўна.

Трывога зразумелая: аплата за здадзенае малако знаходзіцца ў прамой залежнасці ад яго тлустасці. І калі тлустасць ніжэйшая за базісную (3,6 %),то, адпаведна, пры разліку са здатчыкам перапрацоўчае прадпрыемства выкарыстоўвае паніжальны каэфіцыент.

> **«На тлустасць малака ўплываюць розныя фактары. Многае залежыць ад пароды, генетычнага патэнцыялу жывёлы, яе ўзросту. Вышэй тлустасць і тады, калі даенне кароў адбываецца тройчы ў суткі, прычым, найвышэйшы працэнт тлушчу — у паўдзённым удоі.**

Арганізацыяй збору малака з прыватных падворкаў вёскі Ардашы з далейшай транспарціроўкай на прадпрыемства «Смаргонскія малочныя прадукты» займаюцца індывідуальны прадпрымальнік Ала Былінская з мужам Генадзем. Яны маюць два малакавозы і наймаюць на працу малаказборшчыкаў. Як правіла, раз у 10 дзён праводзіцца адбор проб малака. Зыходзячы з гэтых паказчыкаў па масавай долі тлушчу, перапрацоўшчыкі разлічваюцца з вяскоўцамі. А бізнес прадпрымальніка ад тлустасці малака, па сутнасці, не залежыць — прадпрыемства плаціць яму за перавозку, танаж. Хаця, зразумела, іх таксама не можа не хваляваць якасць прадукцыі, якой займаюцца. Таму калі ўзнікнуць падазрэнні наконт несумленнасці кагосьці са здатчыкаў, фальсіфікацыі малака, то пробы могуць брацца і часцей, кажа Генадзь Былінскі.

Што тычыцца гэтай канкрэтнай сітуацыі, то па просьбе рэдакцыі старшыня Крэўскага сельскага выканаўчага камітэта Сяргей Капыш ініцыяваў стварэнне камісіі ў складзе спецыялістаў вытворчай лабараторыі прадпрыемства «Смаргонскія малочныя прадукты» і ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні райвыканкама. Два дні запар яны ў прысутнасці старшыні сельвыканкама праводзілі ў вёсцы Ардашы кантрольны адбор проб малака на вызначэнне якасных паказчыкаў (масавая доля тлушчу, бялку, гушчыня, наяўнасць вады) пры адпраўцы на перапрацоўку ў Смаргонь. Прычым на падворку не толькі аўтара ліста, але і іншых сялян: 17 ліпеня пробы браліся ў адзінаццаці здатчыкаў, назаўтра — у шаснаццаці. Якія вынікі?

Перада мной адпаведныя акты: карціна, так бы мовіць, даволі стракатая. Напрыклад, у каровы Галіны Пятроўскай тлустасць малака аказалася нават ніжэйшай за названую ў лісце: адпаведна, 2,86 і 2,82%. Ёсць у акце і яшчэ горшыя паказчыкі, але ёсць і значна лепшыя, калі колькасць тлушчу перавышае 4% (максімум — 4,89%). Значна адрозніваюцца і вынікі на наяўнасці вады: у каровы Галіны Васільеўны — 0,26% і 1,34%, у шэрагу проб гэты паказчык увогуле нулявы. Аднак у некаторых здатчыкаў — 8,43%, 8,68%, 9,85%...

Вядома ж, не злоўлены — не злодзей. Аднак ці можна па гэтых актах зрабіць выснову, што ў некаторых выпадках у малако даліваюць ваду? Можна, лічыць галоўны спецыяліст камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама Надзея Войтка: калі нізкія паказчыкі па гушчыні, масавай долі бялку, але затое амаль 10% вады.

Што ж тычыцца тлустасці малака, дык на гэты паказчык (калі перад здачай не адбываецца працэс зняцця вяршкоў) уплываюць самыя розныя фактары, звяртае ўвагу здатчыкаў загадчык сектара па закупках і нарыхтоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама Сяргей Дубовы. Многае залежыць ад пароды, генетычнага патэнцыялу жывёлы, яе ўзросту (найвышэйшая тлустасць малака — у чацвёртую-пятую лактацыю). Пры гэтым у кароў, якія ацяліліся вясной і летам, малако больш тлустае ў параўнанні з жывёламі асенне-зімовага ацёлу. Вышэй тлустасць і тады, калі даенне кароў адбываецца тройчы ў суткі, прычым, найвышэйшы працэнт тлушчу — у паўдзённым удоі.

На якасць малака таксама ўплываюць умовы ўтрымання жывёлы: памяшканні павінны быць сухімі, чыстымі, асветленымі, каровам патрэбны аптымальны рухальны рэжым. А галоўнае — паўнацэннае кармленне. У прыватнасці, тлустасць малака павялічвае пасьба на разнастайным травастоі, а зніжае — празмернае скормліванне саломы і бурачніку. Акрамя таго, у рацыёне жывёлы павінны быць кобальт, ёд, цынк і іншыя мікраэлементы. Калі карміць толькі тымі кармамі, што ёсць у полі, то ў многіх выпадках цяжка мець высокія паказчыкі той жа тлустасці, паколькі іх мінеральны састаў даволі бедны. Асабліва не хапае кобальту, ёду, цынку, іншых мікраэлементаў. Таму варта ўзбагачаць рацыён жывёлы мінеральнымі дабаўкамі, якія прадаюцца ў ветэрынарных аптэках, раіць Сяргей Дубовы.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыя газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 22.855. Нумар падпісаны ў 19.30 31 ліпеня 2013 года.

■ Ёсць прапанова!

ПАРАВОЗЫ СТАЯЦЬ, А БАБРЫ ПРАЦУЮЦЬ,

або Чаму няпоўнасцю выкарыстоўваюцца турыстычныя магчымасці?

Неяк на адным тэлеканале ўбачыў, як у Новай Зеландыі, напрыклад, турысты могуць праехаць на рэтра-цягніку па маляўнічых мясцінах краіны. А што ў нас?

Год таму ўсе беларускія газеты пісалі, што з Крычава стары паравоз перапраўлены ў Ліду, дзе яго аднавілі. Пабыў гэты паравоз і ў Баранавічах. А ў канцы снежня 2012-га на станцыі Парэчча ў Гродзенскім раёне з нагоды 150-годдзя Беларускай чыгункі было разыграна тэатралізаванае прадстаўленне па матывах візіту чыноўнікаў з Санкт-Пецярбурга ў сувязі з адкрыццём першага чыгуначнага ўчастка на беларускай зямлі. Дзеля гэтага прыехаў яшчэ адзін паравоз з калекцыі, што ў Баранавічах.

Абодва паравозы затым прастаялі з тыдзень ці крыху больш каля дэпо ў Гродне, далі развітальныя гудкі, якія было чуваць на значнай адлегласці, і рушылі назад у Баранавічы, дзе знаходзяцца і зараз. А ў Парэччы побач з адноўленым вакзалам застаўся макет паравоза ў маштабе прыкладна 1:4 (*на здымку*). Хаця і былі размовы пра выкарыстанне рэтра-цягніка ў турыстычных мэтах.

З яго вокнаў можна паказаць, напрыклад, запруду, пабудаваную бабрамі каля вёскі Багушоўка. Пра яе «Звязда» расказвала летась у пачатку лістапада. Неўзабаве запруду разбурылі, каб вызваліць калгасныя палеткі ад затаплення, і да нядаўняга часу баброў каля яе не было. Не відаць іх было і каля возера Вераўское. Падумалася, што баброў ужо хтосьці забіў (у СМІ паведамлялася, што цяпер прапрацоўваецца пытанне выкарыстання мяса гэтых жывёл у харчовых мэтах). Аднак напрыканцы я заўважыў, як, мабыць, маладыя бабры востраць зубы, згрызаючы кару з асін на берагах гэтага возера. Яшчэ ніводнага дрэўца не павалілі, але шмат з іх згрызлі напалову.

Арганізаваным турыстам убачыць «работу» баброў лягчэй за ўсё каля чыгуначнага прыпынку «Салацце», куды можна прыехаць на цягніку «Гродна—Узбярэж». Выйшаў з цягніка — і метраў праз 50 злева можна разгледзець хатку бабра каля зарослай хмызняком запруды *(на здымку)*. А злева ад чыгуначнага насыпу відаць каналы, прарытыя бабрамі на месцы броду, па якім дачнікі ездзілі на сваіх аўтамабілях. Вада тут паднялася з-за таго, што непадалёк ёсць новая запруда, дзе жыве другая бабровая сям'я.

Дык што ж з паравозам? Прапаную даставіць адзін з іх (з рэтра-вагонам) на станцыю «Раённая», што побач з вуліцай Белыя Росы ў Гродне. Ездзіць далёка на старых паравозах будзе вельмі дорага (хіба што па замове кампаніі багатых турыстаў), а вось пракаціцца ў межах названай станцыі — гэта рэальна. Няхай дзеці і ўсе ахвотныя паглядзяць, што такое паравоз, ад якога я ўцякаў на станцыі Пухавічы ў першыя пасляваенныя гады, калі ён моцна загудзеў.

Лічу, што ў Беларусі рэклама цікавых турыстычных аб'ектаў праводзіцца недастаткова. Можа, таму нашы людзі часта едуць у Турцыю, Егіпет і іншыя краіны, вывозячы туды валюту.

Сяргей ЛАДУЦЬКА,
дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, кандыдат тэхнічных навук.
Фота аўтара

■

ЗАРЭГІСТРАВАНЫХ БЕСПРАЦОЎНЫХ СТАЛА МЕНШ

У эканоміцы Беларусі ў першым паўгоддзі сёлета было занята 1 млн 534,4 тысячы чалавек, што на 1,1 працэнта менш, чым за адпаведны перыяд летась, паведамілі рэдакцыі ў Нацыянальным статыстычным камітэце краіны.

Паводле інфармацыі Мінсацабароны, колькасць беспрацоўных, зарэгістраваных у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, па стане на пачатак ліпеня 2013 года склала 22,6 тысячы чалавек, што на 18,9 працэнта менш, чым на пачатак ліпеня летась. Узровень беспрацоўя на гэты час сёлета склаў 0,5 працэнта ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва краіны.

Арганізацыямі рэспублікі (без малых і мікраарганізацый без ведамаснай падпарадкаванасці) у першым паўгоддзі сёлета прынята на працу 377,1 тысячы чалавек, у тым ліку на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы — 20,9 тысячы чалавек.

Сяргей КУРКАЧ.

МАГІЛЁЎ І БРАНСК У «СЛАВЯНСКІМ КОЛЕ»

Новы турыстычны маршрут аб'яднае гістарычныя і культурныя славутасці памежных абласцей.

Стварэнне такога маршруту прадугледжвае праграма партнёрства Бранскай і Магілёўскай абласцей, якую днямі падпісалі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік і губернатар Браншчыны Мікалай Дзенін. Планы распісаны на два гады: супрацоўніцтва плануецца ў сферы прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю, культуры і турызму. Абодва бакі зацікаўлены ў стварэнні сумесных вытворчасцяў. Напрыклад, у Бранску зацікавіліся магчымасцямі адкрытага акцыянернага таварыства «Магілёўліфтмаш», таму што многія ліфты ў расійскім абласным цэнтры падлягаюць замене. Магілёўскі завод «Строммашына», паводле паведамленняў бранскіх інфармацыйных рэсурсаў, паставіць тэхналагічнае абсталяванне для будаўніцтва камбіната керамічных будаўнічых матэрыялаў у Бранску. Увогуле знешнегандлёвы абарот Бранскай і Магілёўскай абласцей склаў летась каля 87 мільёнаў долараў і павялічыўся амаль удвая.

Ілона ІВАНОВА.

БЕЛАРУСКАЯ АЭС: У АСТРАВЕЦ ЗАПРАШАЕЦЦА ЛІТОЎСКАЯ ГРАМАДСКАСЦЬ

17 жніўня 2013 года ў інфармацыйным цэнтры Беларускай АЭС у горадзе Астравец (у 12.00) адбудзецца сход літоўскай грамадскасці і спецыялістаў па абмеркаванні справаздачы аб Ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе (АУНА) Беларускай АЭС. Абмеркаванне будзе праводзіцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі камітэта па выкананні канвенцыі аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце (канвенцыя Эспа).

Са справаздачай АУНА можна будзе азнаёміцца на літоўскай, рускай і англійскай мовах.

Для грамадзян Літвы, якія выказалі жаданне ўзяць удзел у сходзе, Пасольствам Беларусі ў Літве будзе забяспечана бясплатная візавая падтрымка, а таксама дастаўка ўдзельнікаў мерапрыемства з пагранічнага перахода «Каменны Лог» у горадзе Астравец і назад.

«Я думаю, што Беларусь робіць па-сяброўску, па-суседску. У нас у Літве ўзнікае шмат пытанняў у сувязі з будаўніцтвам атамнай станцыі ў Астраўцы. У тым ліку і па прычыне недастатковай інфармаванасці. Спадзяёмся, што ў час гэтага абмеркавання будуць дадзены вычарпальныя адказы на хвалюючыя пытанні», — сказаў карэспандэнту «Звязды» **доктар сацыяльных навук Іонас Велівіс.**

«Добра, што беларусы, запрашаючы прадстаўнікоў літоўскай грамадскасці ў Астравец, робяць гэта адкрыта і добразычліва. Справаздачу АУНА пераклалі на літоўскую мову, выдаюць бясплатныя візы, забяспечваюць транспартам, ствараюць магчымасць загадзя праз інтэрнэт задаваць пытанні і пасылаць каментарыі па гэтай справаздачы ў дырэкцыю будаўніцтва атамнай электрастанцыі або Пасольству Беларусі ў Літве», — падзяліўся з карэспандэнтам «Звязды» **мастак і мастацтвазнаўца Альбертас Вайдыла.**

Літоўская прэса ў цэлым таксама прыхільна сустрэла беларускую ініцыятыву адкрытага дыялогу.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.
г. Вільнюс.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Белсвязьстрой» (продавец) проводит повторный аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

здание производственного корпуса,

общей площадью 4385.0 кв.м (инв. № 500/С-32244) на земельном участке с кадастровым номером 500000000004000721 (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования), расположенном по адресу: г. Минск, ул. Стебенева, 10 А, площадь земельного участка – 0,6888 га.

На земельном участке имеются ограничения (обременения) прав в использовании: охранная зона ливневой канализации площадью 0,1880 га, охранная зона водопровода площадью 0,1827 га.

Объект находится в залоге (ипотеке).

При переходе к другому лицу права на имущество ипотека сохраняется. Часть указанного недвижимого имущества сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

Начальная цена с НДС – 27 175 600 800 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (2 717 560 080 бел. руб.), перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда» от 29.05.2013 и от 09.07.2013.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **15.08.2013 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 14.08.2013 до 12.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

ЗАО «1 Мая» Несвижского района Минской области

СРОЧНО ТРЕБУЮТСЯ НА ПОСТОЯННУЮ РАБОТУ:

- **ГЛАВНЫЙ ВЕТВРАЧ;**
- **ВЕТВРАЧ-ГИНЕКОЛОГ.**

Заработная плата достойная.
Предоставляется благоустроенное жилье.

Тел.: **8 (01770) 35 3 49, 35 2 99, (8 029) 639 29 87.**

УНП 600032170

В суд Речицкого района Гомельской области поступило заявление Смеяна Павла Павловича об объявлении умершим СМЕЯНА Евгения Павловича, родившегося 28 февраля 1974 года в д. Пригородная Речицкого района Гомельской области, имеющего регистрацию по адресу: г. Речица, ул. Ленина, д. 207, кв. 1, последнее известное место жительства которого: Гомельская область, Речицкий район, д. Бабичи, ул. Медовая, д. 9.

Просим граждан и юридических лиц, имеющих сведения о Смеяне Евгении Павловиче, сообщить их суду Речицкого района в течение двух месяцев с момента публикации.

ДОБРУШСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 15 августа 2013 г. ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь в г. Добруше Гомельской области

		ЛОТ № 1
1	Адрес земельного участка	г. Добруш, ул. Щорса, 14А
2	Кадастровый номер	321250100001003210
3	Площадь земельного участка	0,1352 га
4	Целевое назначение	для строительства и обслуживания одноквартирного блокированного жилого дома
5	Инженерная инфраструктура*	электричество, газ, водопровод
6	Наименование ограничений	Земельный участок расположен в водоохранной зоне реки Ипуть
7	Затраты на организацию и проведение аукциона (рублей)	4 462 168
8	Начальная цена земельного участка (рублей)	34 100 820
9	Задаток (рублей)	6 500 000

Аукцион состоится **15 августа 2013 г. в 10.00.** Место проведения аукциона: г. Добруш, ул. князя Ф.И. Паскевича, 9, малый зал райисполкома.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Добруш, ул. князя Ф.И. Паскевича, 9, каб. 4 (землеустроительная служба). Окончание приема заявлений и документов: **9 августа 2013 г. в 17:00**.

Контактные телефоны в г. Добруше: 8 02333 3 29 94, 8 02333 3 03 48.

Задаток на участие в аукционе перечисляется на расчетный счет **Добрушского районного исполнительного комитета № 3642400009069, ОКПО 04063380, УНН 400006257 в ЦБУ № 309 филиала № 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Добруш.**

Для участия в аукционе гражданин, негосударственное юридическое лицо Республики Беларусь (далее – юридическое лицо) лично или через своего представителя либо уполномоченное должностное лицо в установленный в извещении срок подают **следующие документы**:

- заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий счет с отметкой банка;
- гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);
- представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копия документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией на земельный участок в землеустроительной службе Добрушского райисполкома, а также осмотреть участок на местности.

Аукцион признаётся несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляется в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Добрушский районный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлению победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

**** В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение.***

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 1202117 **считать недействительным.** УНП 101883943

Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»

Согласно решению внеочередного общего собрания акционеров, ОАО «МАПИД» сообщает следующее:

- выплата дивидендов за I полугодие 2013 года будет осуществляться с 1 сентября 2013 года по 31 сентября 2013 года;
- установлен следующий порядок выплаты дивидендов:
  - акционерам, работникам Общества – путем перечисления на вкладные счета;
  - юридическим лицам – путем перечисления на расчетный счет;
  - сторонним акционерам, физическим лицам – путем перечисления депозитарию ООО «Лидеринвест» с последующей выплатой (г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, оф. 241). При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Администрация.

УНП 100008115.

